«ЧАРАЎНІЦЫ»: КОЖНАЯ З ІХ НА СЦЭНЕ – КАРАЛЕВА

ЧЫРВОНКА

У КАРАБЛЯ «РУДАКОВА» МАЛАДЫ КАПІТАН

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

30 САКАВІКА 2023 г. ЧАЦВЕР № 60 (29940)

ЦЫТАТА ДНЯ

Алег МАКАРАЎ, дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў:

«Складана прадбачыць і казаць пра нейкія чаканні ад Паслання Прэзідэнта народу і парламенту. Відавочна, што ёсць шэраг дакладных пытанняў, якія былі пастаўлены кіраўніком дзяржавы на выніковым Саўміне, якія датычацца эканомікі і развіцця. І тэма эканамічнага развіцця Беларусі, новых вектараў, новых рынкаў, развіццё сацыяльнай сферы, бо гэта — прыярытэт нашай краіны, прыярытэт Прэзідэнта Беларусі. Мы ад кожнага Паслання чакаем уяўлення будучыні: таго, як нам жыць далей. Мы потым звяраем сваё жыццё з ім».

ЦЕРАЗ НЁМАН — ПА АБНОЎЛЕНАЙ ПЕРАПРАВЕ



Фота БелТА.

У Гродне завяршаецца рэканструкцыя мастоў цераз Нёман. Цяпер поўным ходам ідуць работы на апошняй, чацвёртай, пераправе. Паповіцкі мост пабудаваны ў пачатку 1970-х і з таго часу яго ні разу капітальна не рамантавалі. А нагрузка велізарная: ён звязвае некалькі мікрараёнаў па абодва бакі ракі. На пад'язных дарогах на месце ўкладваюць асфальт — укладка павінна завяршыцца да 31 сакавіка. На аб'екце паралельна працуе каля 100 чалавек. 14 красавіка мост па вуліцы Паповіча пройдзе выпрабаванне на пацвярджэнне праектных характарыстык. А 17 красавіка рух па ім адкрыюць для транспарту і пешаходаў.

КАРОТКА

- **Пасланне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу адбудзецца 31 сакавіка, пачатак мерапрыемства — у 11.00. Выступленне кіраўніка дзяржавы ў прамым эфіры можна будзе глядзець на ўсіх нацыянальных тэлеканалах, уключаючы спадарожнікавы, трансляцыя будзе арганізавана ў эфіры Беларускага радыё і на сайце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама на YouTube-каналах дзяржаўных СМІ.**
- БелАЗ у 2022 годзе адгрузіў у Расію прадукцыі больш чым на $800 млн.
- **Прадпрыемствы Мінпрама ў 2023 годзе плануюць выпуск прадукцыі больш як на Br27 млрд.**
- Брэсцкі тэатр лялек атрымаў запрашэнне на міжнародны фестываль у Вялікім Ноўгарадзе.

Лічбавы беларус

Вехі развіцця электроннага рынку дзяржпаслуг

Як ствараліся «лічбавыя» рэйкі для вагончыкаў з электроннымі паслугамі

Анлайн-узаемадзеянне дзяржавы з беларусамі і бізнесам працягвае актыўна развівацца, і ўсё больш аперацый па атрыманні пэўных дзяржпаслуг пераходзіць у лічбавую сферу. Летась праз адзіны партал электронных паслуг (platform.gov.by), які з'яўляецца адзінай пляцоўкай электронных дзяржаўных сэрвісаў, было заказана і атрымана звыш 76,2 мільёна паслуг. Пры дапамозе партала сёння аказваюцца 292 віды сэрвісаў: 190 электронных паслуг і 102 адміністрацыйныя працэдуры, аднак гэта яшчэ не ўсё. Будаўніцтва электроннага ўрада ў краіне працягваецца, і значную ролю ў дадзеным працэсе адыгрывае Нацыянальны цэнтр электронных паслуг, які нядаўна адзначыў сваё 11-годдзе. Як за мінулы час ствараласа зручная сістэма для арганізацыі электронных стасункаў чалавека з дзяржавай, расказалі ў Цэнтры.

СТАР. 4

Спажывец

БЕЗ ВІТАМІНАЎ НЕ ЗАСТАНЁМСЯ

Вытворчасць агародніны ў нашай краіне дазваляе цалкам забяспечыць унутраны рынак айчыннай прадукцыяй. Пра гэта расказалі прадстаўнікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, МАРГ і Белкаапсаюза.

— Агародніна, у прыватнасці, «баршчавым наборам», наша краіна забяспечвае сябе поўнасцю, — падкрэсліла **начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Наталля МЕЛЬНІКАВА.** — Узровень самазабеспячэння агароднінай складае больш як 100 працэнтаў. Напрыклад, бульбы ў Беларусі вырошчваецца ў 13 разоў больш, чым спажываецца. Але недацягваем да поўнай забяспечанасці па яблыках — усяго 74 %, — адзначыла спецыяліст.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

Акцэнты

Адэкватныя крокі ў адказ

Што наконт наяўнасці на тэрыторыі Беларусі тактычнай ядзернай зброі думаюць эксперты

Рэзананс вакол планаў па размяшчэнні на тэрыторыі нашай дзяржавы расійскай тактычнай ядзернай зброі не сціхае. Больш за тое — працягвае нарастаць. І зразумела чаму. Аднак што б ні казалі нашы апаненты, дадзены крок стане гарантам бяспекі не толькі ў Беларусі, але і ў рэгіёне ў цэлым.

Як заўважылі ў Міністэрстве замежных спраў Беларусі, на працягу апошніх двух з паловай гадоў наша краіна падвяргаецца беспрэцэдэнтнаму палітычнаму, эканамічнаму і інфармацыйнаму ціску з боку ЗША, Вялікабрытаніі і іх саюзнікаў па НАТА, а таксама дзяржаў Еўрапейскага саюза. Прычым аднабаковыя прымусовыя меры ў палітыцы і эканоміцы суправаджаюцца нарошчваннем на тэрыторыі суседніх краін — членаў НАТА ваеннага патэнцыялу ў непасрэднай блізкасці каля беларускіх граніц. «Беларусь робіць вымушаныя дзеянні ў адказ па ўмацаванні ўласнай бяспекі і абараназдольнасці, — акцэнтавалі ўвагу ў беларускім знешнепалітычным ведамстве. — Ваеннае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ажыццяўляецца ў строгай адпаведнасці з міжнародным правам». Акрамя таго, як заўважылі ў прэс-службе міністэрства, гэта не з'яўляецца новым у сферы ваеннага супрацоўніцтва няядзернай і ядзернай дзяржаў. У НАТА даўно існуе падобная практыка.

Сваімі меркаваннямі наконт размяшчэння на тэрыторыі нашай дзяржавы тактычнай ядзернай зброі з карэспандэнтамі «Звязды» падзяліліся парламентарыі.

Андрэй САВІНЫХ:

«Наяўнасць ядзернага арсенала будзе спрыяць узмацненню геапалітычнай вагі Беларусі»

Як перакананы **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй Савіных,** размяшчэнне ядзернай зброі паўплывае на геапалітычную ролю Беларусі. «У сярэдзіне мінулага стагоддзя ядзерная зброя змяніла характар любых міжнародных канфліктаў, па сутнасці, стаўшы зброяй стрымлівання, — нагадаў парламентарый. — Яна выключыла магчымасць прамога ваеннага канфлікту паміж СССР і ЗША, як і паміж іншымі краінамі, што валодалі ядзернай зброяй. Гістарычны факт — у Ірака і Лівіі не было ядзернай зброі, не было зброі масавага паражэння любых відаў, і гэтыя краіны сутыкнуліся з інтэрвенцыяй краін Захаду. А ў Паўночнай Карэі, якая лічыцца ізгоем, ёсць ядзерная зброя, і ніхто нават не думае аб ваенным уварванні ў гэтую краіну. Гэта вельмі паказальны факт, які мы не можам не ўлічваць у сучасным свеце. У сувязі з вышэйзгаданым размяшчэнне ядзернай зброі на тэрыторыі Беларусі, без усякага сумнення, можна разглядаць як фактар стрымлівання любых агрэсіўных памкненняў або замахаў на нашу краіну».

Па словах старшыні Пастаяннай камісіі, наяўнасць ядзернага арсенала — гэта таксама фактар, які будзе спрыяць узмацненню геапалітычнай вагі Беларусі. Сёння свет дзеліцца на буйныя палітычныя блокі, у якія краіны аб'ядноўваюцца для гарантавання бяспекі. Прычым такое аб'яднанне адбываецца перад пагрозай пераважна ад краін калектыўнага Захаду, якія хочуць захаваць сваё дамінаванне ў свеце. У якасці прыкладаў Андрэй Савіных прывёў выбудоўванне партнёрскіх адносін Расіі з Кітаем, цікавасць многіх краін да БРІКС і магчымасцяў эканамічнага супрацоўніцтва ў рамках названай арганізацыі, рост значнасці ШАС як рэгіянальнай арганізацыі.

«Рэспубліка Беларусь заўсёды знойдзе магчымасці для ўмацавання даверу і ўзаемнай падтрымкі з дзяржавамі, якія хацелі б выбудаваць больш справядлівы светапарадак, шматпалярны свет, — адзначыў Андрэй Савіных. — Што да краін Захаду, мне здаецца, дыялог з імі сёння немагчымы. Менавіта яны ідуць на канфрантацыю, яны паглыбляюць раздзяляльныя лініі, яны хацелі б абвальвання сучаснай эканамічнай сістэмы, у тым ліку і для перафармацiравання свету на прымальных для іх умовах. У адносінах з гэтымі краінамі патрэбныя не перагаворы, а намаганні, накіраваныя на ўмацаванне ўласнай бяспекі. Яны павінны разумець, што нападзенне на нас можа мець сур'ёзныя наступствы. І размяшчэнне ядзернай зброі — першы крок у такім напрамку».

Лілія АНАНІЧ:

«Краіна, якая валодае ядзернай зброяй, ніколі не дазволіць, каб да яе ставіліся непавазліва»

Як звярнула ўвагу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Лілія Ананіч,** міралюбівая знешняя палітыка Беларусі і абарончая дактрына зусім не азначаюць, што наша краіна гатовая стаць ахвярай у руках авантурыстаў, якія сёння, на жаль, кіруюць у краінах калектыўнага Захаду. «Мы бачым, што на працягу апошняга часу менавіта калектыўны Захад зрабіў усё для таго, каб прывесці свет у стан небяспечнага нагнятання ваеннага супрацьстаяння, — адзначыла парламентарый. — Мы бачым, як паслядоўна калектыўны Захад прасоўваў свае зусім не абарончыя, а наступальныя ўзбраенні на еўрапейскую тэрыторыю. Сёння заходняя, у тым ліку ядзерная, зброя размешчана ў Бельгіі, Германіі, Італіі, Нідэрландах і ў Турцыі, якая не ўваходзіць у Еўрасаюз. Аб чым тое сведчыць? Аб тым, што ўсе абяцанні, якія былі дадзены Беларусі пасля вывазу з нашай тэрыторыі ядзернай зброі, парушаны. Нас не тое што не абаранілі, нас сёння ўжо спрабуюць адкрыта знішчаць».

Лілія Ананіч нагадала, што калі беларускі народ абмяркоўваў змяненні ў Канстытуцыю, паўсюдна гаварылася аб тым, што Беларусь — міралюбівая краіна, але, захоўваючы абарончую дактрыну, мы павінны быць гатовыя адказаць на любыя замахі ў адносінах да нашай дзяржавы. «Таму тыя крокі, якія сёння агучаны, — гэта лагічны працяг умацавання суверэнітэту, незалежнасці нашай краіны і гатоўнасці ў поўным аб'ёме адстаяць інтарэсы Саюзнай дзяржавы, нашу цэласнасць, — падкрэсліла дэпутат. — Безумоўна, мы сёння кажам аб тым, што крок на апярэджанне — гэта не сённяшняе рашэнне. Гэта глыбокая аналітыка, разуменне тых працэсаў, якія адбываюцца, тая рыторыка і канкрэтыка, калі нас літаральна аблажылі з усіх бакоў найбуйнешымі ваеннымі натаўскімі групоўкамі, разнастайным нагнятаннем напружання».

На думку намесніка старшыні Пастаяннай камісіі, заявы аб магчымасці паставак Украіне зброі з абедненым уранам або выказванні польскіх ачумелых вайскоўцаў, якія кажуць, што на працягу трох дзён можна захапіць Беларусь, не проста пустыя словы. «Гэта дзесьці напісаныя сцэнарыі бліцкрыгу, — удакладніла Лілія Ананіч. — Мы не дазволім! І цвёрдая пазіцыя нашага нацыянальнага лідара — Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі — яркае таму сведчанне. Мы не дазволім, каб нас заспелі знянацку. Краіна, якая валодае ядзернай зброяй, тактычным ядзерным патэнцыялам, ніколі не дазволіць, каб да яе ставіліся непавазліва. І менавіта таму ў Беларусі будзе мір, адзінства беларускага народа і гатоўнасць абараніць сваю краіну, нашу любімую Рэспубліку Беларусь».

Па словах парламентарыя, фактычна, валодаючы атамнай электрастанцыяй, Беларусь ужо з'яўляецца ядзернай краінай. «А з тактычнай ядзернай зброяй мы ўзмацняем свой абарончы патэнцыял і дзейнічаем на апярэджанне», — акцэнтавала ўвагу дэпутат.

Вераніка КАНЮТА.
Валерыя СЦЯЦКО.

Па сутнасці

ДАРОГА ДА СЯБЕ

Мабыць, гэта самыя сумныя і жалобныя сосны ў Беларусі. Здаецца, што тут, нягледзячы на ажыўленую шашу, машыны зніжаюць хуткасць, а ўсмешкі ў людзей знікаюць. Гэта паварот на Хатынь.

Самая вядомая з нежылых вёсак і самая нежылая з вядомых. Звон Хатыні гучыць не толькі тут, ён гучыць у сэрцы кожнага сапраўднага беларуса. Памятаеце: у кожнай нашай сям'і — дзеці Хатыні. Гэтыя боль і жалоба — нашай дзяржаўнасці і нашага народа. Бо хатынскі мемарыял увасабляе ўсе выпрабаванні, якія выпалі на долю беларусаў. На долю народа, што заўжды марыў людзьмі звацца. Кіраўніцтва мемарыяла і нашы гісторыкі змаглі ўвасобіць гэты складаны шлях да Беларусі. У новым музеі — цяжка і нават страшна. Але праўдзіва. Сэрца шчыміць, у горле сціскае ад пачутага і ўбачанага. На інтэрактыўнай сцяне мяняюцца рымскія лічбы стагоддзяў, з вуснаў экскурсавода гучаць страшэнныя лічбы страт. У адным стагоддзі — трэць краіны разбурана, у іншым — палова. Так чумныцы паводзілі заўжды. 140 крыжовых паходаў, 140 карных аперацый. І не важна, былі гэта «хрысціцелі» са штандарамі Святога Прастола ці нацыскія кавалеры жалезнага крыжа. Пад хлуслівым абліччам добрай справы рабавалі і забівалі, гвалтавалі і здзекаваліся. А сёння што, не так? Пад ілжывым абліччам дэмакратычнай дапамогі — тое ж жаданне акупаваць і знішчыць. Беларусы, мы нарэшце павінны зразумець і ўцяміць — чаму нас толькі 10, а не 30 мільёнаў, чаму мы не такія заможныя, як немцы, брытанцы або амерыканцы. Бо мы ніколі не ішлі вайной. Ніколі не палілі чужыя вёскі. Ніколі не адбіралі кроў у дзяцей і жыццё ў цяжарных жанчын! Беларусы, мы нарэшце павінны тое зразумець і ўцяміць. Тады станем больш паважліва адносіцца да таго, што ў нас ёсць, і да тых, хто ўсё гэта нам гарантуе. Каб гэта ўсё зразумець, трэба не забываць Хатынь.

Шлях нашага станаўлення — гэта шлях барацьбы з захопнікамі. Вельмі яскравы артэфакт. Калыска, у якой рэпрадукцыя жывой вёскі. Яшчэ не спаленай Хатыні. А колькі мільёнаў такіх калысак знішчыў вораг. Пакінуў пасля сябе попел.

Апагеем барацьбы за жыццё стала акупацыя «самай цывілізаванай» Еўропай. Немцы і венгры, італьянцы і румыны, латышы і ўкраінцы. Хто толькі за тры гады акупацыі не намагаўся ператварыць нашу зямлю ў папялішча. То быў перыяд, самы жахлівы па маштабах знішчэння нас — беларусаў. За тры гады — кожны трэці. Таму ў кожным з шасці пакояў музея на падлозе — крывавыя рэкі. Яны цякуць у вечнасць.

Дарэчы, зрабіць музей у Хатыні такім, каб сэрца сціскалася, — наказ Прэзідэнта. У век панавання лічбавай філасофіі, гаджэтаў і індустрыі гульняў мала каго чымсьці здзівіш. Нашы душы, нібы камяні, — заімшэлі. Ачышчэнне адбываецца тут — у Хатыні. І больш не ўзнікае пытанняў: чаму 9 Мая і 3 ліпеня — самыя святыя даты для сапраўдных беларусаў. І больш не ўзнікае пытання: чаму ў нас не засталося гістарычнай спадчыны, як у Луўры, і багацця, якое перадавалася з пакалення ў пакаленне драпежнымі еўрапейцамі. Нашу зямлю ператваралі ў «раскіданае гняздо». У хатынскае папялішча.

Але не атрымалася. Кожны год шырокая плынь беларусаў імкнецца ў Хатынь — да Няскоранага. Ад чалавечага жалю снег ператвараецца ў ручаі. Слёзы жалю па ахвярах і слёзы надзеі на будучыню. Бо працягваецца род беларусаў. Бо нават і ў Хатыні разам з набатам звануў на месцы спаленых хат гучыць цяпер дабравесце царкоўнага звона — сімвала Жыцця і Вечнасці.

Сімвалічна 22 сакавіка — час вясновага раўнадзенства, вяртання птушак з выраю і праваслаўнага свята сарака мучанікаў. Дзеці, жанчыны і старыя Хатыні — хіба не праведнікі беларускага народа, хіба не тыя душы памерлых продкаў, што разам з птушкамі вяртаюцца ў родныя гнёзды? Нават сонца ў гэты дзень паварочваецца да жыцця.

Але гэты боль зямлі ні заходнія гегемоны, не менеджары суседніх (дарэчы, славянскіх) краін не адчуваюць. Ад улады капіталу і заходняй мадэлі іх душы заплеснелі. Вось ім бы прыехаць у Хатынь і адчуць увесь жах вайны хоць бы ў музеі. Не прыедуць.

Дарогу ў Хатынь не забывае наш Прэзідэнт. Як сапраўдны бацька, з дзецьмі. Разам з усёй краінай яны схіляюць галовы перад болем і непераможнасцю нашых продкаў. Хатынь — вось тая дарога, якая дапаможа застацца беларусам у будучыні. І неабавязкова чакаць новай даты. У школьнікаў краіны цяпер канікулы — чаму б не правесці тут урок агульнанацыянальнай памяці. Стаіць Няскораны беларус — бацька — і глядзіць у будучыню свайго народа, кожнаму з нас у вочы.

Яўген ПУСТАВОЙ.

Блізкая ўлада

Разгледзець пытанні з улікам абставін

Намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка правёў прыём грамадзян у Любанскім райвыканкаме

Людзі задавалі пытанні па ўстанаўленні працоўнага стажу і добраўпарадкаванні тэрыторыі. Так, Праскоўя Міхайлаўна і Андрэй Андрэевіч з Любані звярнуліся наконт залічэння ў стаж дзяржаўнай грамадзянскай службы перыяду работы ў сельскагаспадарчых арганізацыях у якасці галоўных спецыялістаў. Неабходных архіўных дакументаў, якія пацвярджаюць такую работу, не захавалася.

Ігар Петрышэнка адзначыў, што сітуацыя нестандартная. «Можна сказаць, што гэта прэцэдэнт, такі зварот паступае ўпершыню. Нашы структуры павінны вызначыць, па якім шляху вам ісці, калі няма архіўных пацвярджэнняў, даведацца, у якім фармаце можна прадставіць доказы. Я даручу профільным дзяржаўным органам, Міністэрству працы і сацыяльнай абароны з улікам усіх абставін разгледзець ваша пытанне», — канстатаваў намеснік прэм'ер-міністра.

Жыхара Любані Мікалая Мікалаевіча цікавіла пытанне добраўпарадкавання тэрыторыі і якасці работы мясцовай ЖКГ. У прыватнасці, мужчына звярнуўся наконт добраўпарадкавання тэрыторыі дзіцячага садка № 4. Ён звярнуў увагу на нездавальняючы стан агароджы і тратуара каля дашкольнай установы. Па словах намесніка старшыні Любанскага райвыканкама Дзмітрыя Сухана, распрацаваны праект добраўпарадкавання мікрараёна, на тэрыторыі якога знаходзіцца дзіцячы садок. Праект прадугледжвае абнаўленне плітачнага пакрыцця і агароджы.

Антаніна Алегаўна з аграгарадка Сосны звярнулася да Ігара Петрышэнкі наконт выдзялення для пражывання іншага жылога памяшкання. Акрамя таго, у жанчыны ўзніклі пытанні па рабоце лазні ў аграгарадку Сосны, якая зачынілася каля сямі месяцаў таму. Дзмітрый Сухан растлумачыў, што лазня ў жыхароў аграгарадка незапатрабаваная, а яе ўтрыманне нерэнтабельнае. Аднак Ігар Петрышэнка даручыў правесці маніторынг сярод мясцовага насельніцтва па пытанні запатрабаванасці і рэнтабельнасці лазні.

У размове з журналістамі віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што прыёмы грамадзян — ключавы функцыянал, які дае магчымасць уладзе слухаць і чуць людзей. «Калі яны ўзнімаюць правамерныя пытанні, гэта дазваляе вырашаць узніклыя праблемы. Вельмі цікава было слухаць нашых грамадзян, якія прыйшлі на прыём, пакольк яны жыва цікавяцца палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і іншымі сферамі жыцця грамадства. Яны ў курсе навел, што ўвайшлі ў абноўленую рэдакцыю Канстытуцыі, ведаюць заканадаўства», — сказаў Ігар Петрышэнка.

Паводле БелТА.

БЕЗ ВІТАМІНАЎ НЕ ЗАСТАНЁМСЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прадстаўніца МАРГа распавяла, што па выніках мінулага года доля продажаў айчыннай агародніны ў Беларусі склала практычна 70 %, бульбы, капусты, морквы і буракоў — больш за 80 %. Часцей, чым у мінулыя гады, выбіраў беларускі спажывец і айчынныя яблыкі.

— Прыемна, што і яблыкі беларускай вытворчасці прыраслі летась на 11 працэнтаў, — адзначыла яна.

Чаго яшчэ не хапае спажыўцу вясной? Асаблівая ўвага аддаецца вытворчасці таматаў і агуркоў, падкрэсліла спецыяліст. МАРГ сумесна з Мінсельгасхарчам вызначана гадавая патрэба ў згаданай гародніне на 2023 год. Цяпер работа накіравана на павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці агуркоў і памідораў менавіта ў міжсезонны перыяд, калі айчыннай прадукцыі ў нас не хапае з прычыны кліматычных умоў.

«Падушка бяспекі»

Каля 11-12 працэнтаў ад усёй вырабленай у краіне агародніны закладваецца ў стабілізацыйныя фонды.

Гародніна і садавіна айчыннай вытворчасці — аснова харчавання і тавар першай неабходнасці. Для забеспячэння іх даступнасці насельніцтву ў міжсезонны перыяд урадам прынята рашэнне аб захаванні рэгулявання цэн на свежую пладова-агароднінную прадукцыю. МАРГ сумесна з Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання выбраны разліковы дапушчальны ўзровень закупачных цэн на прадукцыю, якая закладваецца ў стабфонды, і вызначаны графік маніторынгу закупачных цэн, расказала Наталля Мельнікава.

— Патрэба стабфондаў разлічваецца выходзячы са статыстычнай інфармацыі: яна ўлічвае звесткі за апошнія тры гады, — сказала яна. — Сёння вядзецца работа па падрыхтоўцы разліку патрэбнасці на міжсезонне 2023—2024 гадоў.

Павялічыцца або знізіцца гэтая патрэба, пакуль спецыялісты сказаць негатовыя. Але дакладны разлік вельмі важны: закладваць у стабфонды звыш патрэб не мае сэнсу, інакш прадукцыя не будзе запатрабаваная суб'ектамі гандлю.

— Мы пачынаем работу з буйнымі гандлёвымі сеткамі па заключэнні дагавораў пастаўкі пладова-агароднінай прадукцыі, — адзначыла начальнік управлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

Вырасціць і захаваць

Пра важнасць забеспячэння захаванасці ўраджаю аж да наступнага года гаварыў і **начальнік галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Мікалай ЛЕШЫК.** Бо ў планах на гэты год — нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці сельгаспрадукцыі: павелічэнне на 8-10 працэнтаў практычна па кожнай пазіцыі «баршчавога набору». Мэта — максімальна насыціць паліцы крам якаснай айчыннай гародніной.

— Да 1 красавіка праводзіцца ўдакладненне патрэб у пэўных відах прадукцыі, будуць заключацца дагаворы на яе пастаўку і вызначацца больш канкрэтныя пасяўныя плошчы, — расказаў Мікалай Лешык. — Сельгасарганізацыямі і фермерскімі гаспадаркамі запланавана пасеяць каля 4 тысяч гектараў гародніны. У рабочым парадку пасяўныя плошчы будуць карэкціравацца па асобных відах прадукцыі — у бок павелічэння або зніжэння.

Спецыяліст падкрэсліў, што ў Беларусі сховішчаў дастаткова, але ў пэўных суб'ектаў гаспадарання яны не маюць рэгулюемага газавага асяроддзя і адпаведнага мікраклімату. Такім чынам, узнікаюць складанасці з забеспячэннем захаванасці гародніны і пладоў — у першую чаргу ў канцы красавіка-маі.

— Таму прадугледжана магчымасць праз падтрымку праграмы «Аграрны бізнес» правесці будаўніцтва або мадэрнізацыю сховішчаў, — падкрэсліў Мікалай Лешык. — Суб'екту неабходна ва ўзаемадзеянні з аблвыканкамам вызначыць праект, прапрацаваць з банкамі магчымасць яго крэдытнай падтрымкі і ў далейшым атрымаць кампенсацыю па крэдыце для будаўніцтва або мадэрнізацыі сховішча.

Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Мікалай ЛЕШЫК.

Яшчэ адно надзённае пытанне, якое датычыцца забеспячэння насельніцтва свежай беларускай гароднінай у міжсезонне, — будаўніцтва або мадэрнізацыя цяплічных гаспадарак.

— З лістапада да сакавіка ёсць дэфіцыт у свежых агурках айчыннай вытворчасці — каля 2 тысяч тон, а таксама ў свежых таматах — каля 11 тысяч тон, — сказаў начальнік галоўнага ўпраўлення раслінаводства. — Ён абумоўлены недастатковымі магутнасцямі цяплічных гаспадарак. З 230 га наяўных цяпліц толькі 159 га забяспечваюць неабходны тэмпературны рэжым і ўзровень падсветкі на працягу ўсяго года.

Каб забяспечыць патрэбныя аб'ёмы вытворчасці свежых агуркоў і таматаў у міжсезонне, краіне неабходна мець яшчэ каля 44 га цяплічных гаспадарак або мадэрнізаваць ужо існуючыя. Цяпер праводзіцца абследаванне цяпліц.

«Гарантыя» ад селекцыянераў

Першачарговай задачай магчымасць доўгага захоўвання ўраджаю называюць і селекцыянеры.

— За апошнія чатыры гады па выніках дзяржаўнага сартавыпрабавання ў сельскагаспадарчую вытворчасць дапушчана дзевяць новых сартоў бульбы, — расказаў **дырэктар РУП «Інстытут пладаводства» Аляксандр ТАРАНАЎ.** — Сучасныя беларускія сарты маюць патэнцыяльную ўраджайнасць да 70 тон з гектара.

Сарты «Першацвет» і «Юлія» адрозніваюцца фарміраваннем таварнага ўраджаю ў ранніх тэрміны ўборкі і добра захоўваюцца ў зімовы перыяд. Сярэднеспелыя «Водар» і «Гарантыя» па ўраджайнасці пераўзыходзяць знакаміты «Скарб», кантрольны ў дадзенай групе спеласці. Сярод новых крухмалістых сартоў сярэдняпозняга тэрміну паспявання — «Нара» і «Рубін», а таксама «Крок» сталовага і тэхнічнага прызначэння. Створаны гібрыд капусты белакачаннай «Марана» з патэнцыяльнай ураджайнасцю 110 тон з га, а таксама «Варта» (120 тон з га), дадаў навуковец.

Навінкі па агурках — кароткаплодныя партэнакарпічныя гібрыды ўніверсальнага прызначэння «Духмяны» для адкрытага грунту і «Пачастунак» для плёначных цяпліц. Ранняспелы куставы гібрыд тамата «Зубраня» валодае патэнцыяльнай ураджайнасцю 45,5 тоны з га.

Селекцыянерамі створаны і перададзены на дзяржвыпрабаванні і першы айчынны гібрыд цыбулі рэпчатай «Тутэйшы» — ён адрозніваецца хуткаспеласцю, а яго ўраджайнасць на доследных участках склала 77 тон з га.

Сярод пладовых культур найбольш востра сёння стаіць пытанне па забеспячэнні спажыўца айчыннымі яблыкамі, і навука працуе ў дадзеным кірунку.

— Інстытутам пладаводства створана цэлая лінейка сартоў — ад самых ранніх да здольных ляжаць, — адзначыў Аляксандр Таранаў і параіў садаводам звярнуць увагу на сарты «Алеся», «Весяліна», «Белана», «Імант»: яны здольныя захоўвацца ў звычайным газавым асяроддзі да красавіка-мая.

Здольнасцю доўга захоўвацца адрозніваюцца і грушы «Завея». Сярод іншых распрацовак селекцыянераў — першыя айчынныя сарты рэмантантных малін — «Вераснёвая», «Злата», а таксама айчынны сорт персіка «Лойка», раяніраваны ў Рэспубліцы Беларусь.

— Створаны тры беларускія сарты фундуку: «Лал», «Яшма» і «Аркадзь», па якіх арганізавана навуковае суправаджэнне. У Маладзечанскім раёне закладзены дзясяткі гектараў згаданай культуры, — адзначыў вучоны.

Першы ўраджай ужо на прылаўках

Шукаць айчынную гародніну, беларускія яблыкі-грушы і ягады, зразумела, варта ў гандлёвай сеткі спажывецкай кааперацыі.

— Арганізацыі спажыўкааперацыі штогод бяруць актыўны ўдзел у забеспячэнні спажывецкага рынку айчыннай пладова-агароднінай прадукцыяй, — адзначыла **начальнік упраўлення нарыхтовак Белкаапсаюза Аксана СКІНДЭР.** — А ў аб'ёмах закладкі стабілізацыйных фондаў займаюць у сярэднім па кожнай пазіцыі ад 15 да 20 %. Разумеючы актуальнасць і запатрабаванасць некаторых пазіцый, мы закладваем на захоўванне больш прадукцыі, чым даводзяцца заданні, — падкрэсліла яна.

Белкаапсаюз удзельнічае і ў забеспячэнні сыравінай перапрацоўчых прадпрыемстваў.

— Супрацоўнічаем з перапрацоўшчыкамі ўсіх формаў уласнасці, — сказала Аксана Скіндэр. — З кансервавымі заводамі, вытворцамі ёгуртных дабавак і дзіцячага харчавання (якія патрабуюць самай высокай якасці сыравіны). Развіваем і ўласную перапрацоўку. Сёлета ў Глускім райспажыўтаварыстве рэалізоўваецца інвестыцыйны праект, які дазволіць выпуск замарожанай прадукцыі ў шырокім асартыменце і ў сучаснай упакоўцы.

Асаблівасць спажывецкай кааперацыі — работа не толькі з сельгасарганізацыямі, але і цесны кантакт з насельніцтвам і фермерамі. Гэта дазваляе насыціць рынак у тым ліку шырокім спектрам пладова-агароднінай прадукцыі нетрадыцыйных відаў, адзначыла спецыяліст.

— Работа гэтая вядзецца круглы год. Цяпер мы супрацоўнічаем з больш як 400 фермерскімі гаспадаркамі краіны па розных напрамках пачынаючы ад ранняй агароднінай прадукцыі, якая ўжо ёсць на прылаўках.

За мінулы год насельніцтву Беларусі за здадзеную сельгасдзікарослую прадукцыю было выплачана 340 мільёнаў рублёў, распавяла прадстаўніца Белкаапсаюза. А з улікам гаспадарак і фермераў гэтая сума склала 524 мільёнаў рублёў. У планах на бягучы год — закупка не менш за 15 тысяч тон бульбы, звыш 30 тысяч тон гародніны, 50 тысяч тон пладоў і ягад.

— Арганізацыі спажыўкааперацыі захавалі матэрыяльна-тэхнічную базу, а гэта 91 сховішча з магутнасцю захоўвання каля 20 тысяч тон пладова-агароднінай і ягаднай прадукцыі. Створаны ўмовы для захоўвання прадукцыі, якая патрабуе асаблівых рэжымаў, — бульбы, цыбулі, яблыкаў.

У планах Белкаапсаюза на сёлета — не толькі насычэнне ўнутранага рынку якаснай сельгаспрадукцыяй, але і пошук новых рынкаў збыту. Мінулы год паказаў: беларуская пладовая прадукцыя запатрабаваная і ў Расіі, адзначыла спецыяліст. А фруктовыя віны — новы напрамак работы спажывецкай кааперацыі — экспартуюцца нават у Кітай і там зарэкамендавалі сябе як адзін з высакаякасных беларускіх прадуктаў.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Паўночнай Ірландыі павысілі ўзровень тэрарыстычнай пагрозы да «сур'ёзнага»

Урад Вялікабрытаніі па рэкамендацыі службы контрразведкі MI5 павысіў узровень тэрарыстычнай пагрозы ў Паўночнай Ірландыі са «значнага» да «сур'ёзнага» (чацвёрты ўзровень з пяці). Пра гэта гаворыцца ў распаўсюджанай заяве міністра па справах Паўночнай Ірландыі Крыса Хітан-Харыса. «Рашэнне змяніць узровень пагрозы было прынята MI5 незалежна ад міністраў. MI5 павысіла [узровень] пагрозы ў Паўночнай Ірландыі са «значнага» (атака верагодная) да «сур'ёзнага» (атака высокаверагодная). Грамадства павінна захоўваць пільнасць, але не трывожыцца і працягваць паведамляць аб любых сваіх заклапочанасцях паліцыі Паўночнай Ірландыі», — адзначаецца ў заяве. Брытанскія ўлады аб'явілі аб павышэнні ўзроўню пагрозы тэрарызму ў Ольстэры на фоне расследавання замаху на жыццё супрацоўніка паліцыі ў горадзе Ома, якое адбылося 22 лютага. Праваахоўныя органы падазраюць у нападзенні радыкальна-нацыяналістычную арганізацыю «Новае Ірландскае рэспубліканскае войска».

У Францыі правялі вобыскі ў буйных банках у сувязі з падатковым скандалам

Пракуратура пацвердзіла інфармацыю, якая з'явілася ў выданні Le Monde, аб вобысках у офісах HSBC Holdings, Natixis, Societe Generale, BNP Paribas і Exane (даччыная кампанія BNP). У скаардынаванай аперацыі ўдзельнічалі 160 следчых са Службы судовых фінансавых расследаванняў і 16 пракуроры, паведаміла New-York Times. У ёй таксама ўзялі ўдзел і прадстаўнікі пракуратуры Германіі. У мінулым месяцы нямецкія праваахоўныя органы правялі вобыскі ў дамах звыш дзесяці супрацоўнікаў HSBC у рамках аналагічнай праверкі. Нацыянальная пракуратура Францыі па фінансавых справах (PNF) ужо амаль паўтара года расследуе ашуканскую схему cum-cum, якая дазваляе не плаціць падаткі з дывідэндаў. Схема простая, але даволі эфектыўная: акцыі перад выплатай дывідэндаў фармальна пераводзяцца інвестарам за мяжой, а праз некаторы час вяртаюцца фактычным уладальнікам, якія маюць права не плаціць падаткі з дывідэндаў. Сэканоменыя на гэтай няхітрай аперацыі грошы дзеляцца паміж сапраўднымі і падстаўнымі ўладальнікамі акцый.

Паліцыя Перу канфіскавала звыш двух тон какаіну

Крымінальны груз быў упакаваны ў партыю маёлікі. Канчатковым пунктам прызначэння канфіскаванага рэчыва была Турцыя, паведаміла El Nuevo Diario.

Аперацыя па спыненні незаконнага абароту наркотыкаў дазволіла канфіскаваць больш за 2310 кілаграмаў какаіну ў партовым тэрмінале ў Кальяа. Праваахоўнікі звярнулі ўвагу, што керамічная плітка прагінаецца. Аказалася, што ў скрынкі былі спакаваныя гумавыя блокі, якія імітуюць маёліку, там хавалі партыю наркатычнага рэчыва. Канфіскаваны какаін ацэньваецца прыкладна ў 20 мільёнаў долараў.

Вехі развіцця электроннага рынку дзяржпаслуг

Электронны дакументаабарот для аператыўнасці

Нацыянальны цэнтр электронных паслуг створаны 19 сакавіка 2012 года з мэтай падтрымкі і далейшага развіцця найважнейшых інфармацыйных сістэм, якія складаюць аснову электроннага ўрада Беларусі, аснову аказання дзяржпаслуг.

Першы этап работы Цэнтра — 2012—2014 гады — пачаўся са стварэння інфраструктурных рашэнняў па ўсёй краіне, якія дазволілі б у далейшым развіваць рынак дзяржпаслуг. А для гэтага неабходна было задаволіць базавыя патрэбы, бо пакуль па ўсёй краіне не пракладзены сеткі, пакуль няма інтэрнэту, пакуль не створаны **электронны дакументаабарот,** што дазволіць аператыўна абменьвацца дакументамі і хутка прымаць адміністрацыйныя рашэнні, у тым ліку ў пытаннях аказання паслуг і ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур, немагчыма казаць пра стварэнне суперсэрвісаў і праактыўных паслуг, абазначыла Святлана Караневіч.

— Таму дзейнасць Цэнтра пачалася менавіта з дакументаабароту — неабходна было максімальна ўкараніць электронны дакументаабарот і забяспечыць работу сістэмы міжведамаснага электроннага дакументаабароту (СМДА), каб сістэмы электроннага дакументаабароту (СЭД) не проста стаялі ў розных інстанцыях, а маглі кантактаваць паміж сабой у электронным выглядзе.

Уніфікаваны ключ

У 2014-м адкрыўся і **адзіны рэспубліканскі цэнтр сведчання сертыфікатаў адкрытых ключоў.** Дагэтуль у краіне было шмат такіх цэнтраў, кожны з якіх выпускаў сертыфікаты адкрытых ключоў для работы ў нейкай асобнай інфармацыйнай сістэме. У тыя часы юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам прыходзілася праз гэта мець некалькі ключоў, кожны з якіх падыходзіў да пэўнай сістэмы. Менавіта таму спатрэбілася стварэнне ўніфікаванага цэнтра, які выпускаў бы сертыфікат адкрытых ключоў, што падыходзіць да ўсіх (або большасці) інфармацыйных сістэм. Цяпер такі сертыфікат адкрытага ключа падыходзіць да работы ў больш як 30 інфармацыйных сістэмах.

Інфапасрэднікаў меншае

Інстытут інфармацыйных пасрэднікаў таксама з'явіўся ў згаданы перыяд. У краіне дагэтуль шмат

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



беларусаў, якія не хочуць або не могуць самастойна карыстацца інфармацыйнымі тэхналогіямі. Ім прасцей не аўтарызавацца на адзіным партале, а прыйсці ў падраздзяленне Белпошты ці Белтэлекама, спецыялісты якіх закажуць электронную паслугу ад імя чалавека праз партал. Такіх аддзяленняў, дзе рэалізаваны падобныя магчымасці, у краіне каля 300.

У тэму

11 гадоў работы НЦЭП у лічбах

Летась беларусам аказана 76,2 мільёна электронных паслуг, выпушчана 1,5 мільёна ЭЛП, да СМДА падключана больш чым 16 тысяч абанентаў (з іх дзяржаўнай формы ўласнасці — 15,9 тысячы, астатнія — камерцыйныя арганізацыі, якія ацанілі зручнасць работы сістэмы).

— Аднак праз інстытут інфапасрэднікаў даступныя далёка не ўсе паслугі (а іх сёння 292), якія рэалізаваны на партале. Атрымаць можна толькі каля 20, у асноўным паслугі кадастравага агенцтва па выдачы даведак аб знаходжанні ва ўласнасці грамадзяніна аб'ектаў нерухомасці, — заўважыла спецыяліст. — Рашэнне, ці можна ажыццяўляць паслугу праз пасрэдніка, кожны дзяржаўны орган, які далучаецца да сістэмы аказання электронных паслуг, вырашае самастойна. Як паказвае практыка, цікавасць да інфапасрэднікаў з часам памяншаецца. Расце попыт на самастойныя лічбавыя стасункі чалавека з дзяржавай.

Давераны трэці бок у міжнародных стасунках

Наступная вяха станаўлення рынку электронных паслуг — 2015—2017 гады — Цэнтр становіцца **нацыянальным аператарам даверанага трэцяга боку.**

Электронны дакументаабарот мае на ўвазе выхад за межы краіны, паколькі многія сферы жыццядзейнасці патрабуюць міжнароднага электроннага дакументаабароту. Гэта вельмі зручна, напрыклад, калі суб'екты гаспадарання ў розных краінах абменьваюцца паміж сабой таварамі і могуць дасылаць у электроннай форме суправаджальныя дакументы і накладныя на іх, растлумачыла начальнік аддзела.

— Для юрыдычнай сілы такія дакументы павінны быць падпісаны ЭЛП, які ў кожнай дзяржавы свой.

У Беларусі свая крыптаграфія, якой можна ганарыцца, бо далёка не ў кожнай краіне свету яна ёсць. Ёсць яна і ў Расіі. Каб лічбавыя подпісы розных краін «пасябравалі», іншымі словамі, іх сапраўднасць прымалася ва ўсіх дзяржавах, якія абменьваюцца дакументамі, быў рэалізаваны механізм даверанага трэцяга боку.

У кожнай з краін, што жадаюць электронна ўзаемадзейнічаць, ёсць спецыяльныя прадпрыемствы, закліканы сведчыць сапраўднасць ЭЛП на дакументе, які быў накіраваны за мяжу. Яны робяць адпаведны запыт ва ўпаўнаважаную арганізацыю краіны, адкуль паходзіць дакумент з ЭЛП, і атрымліваюць інфармацыю, што подпіс сапраўдны. Аналагічна правяраецца і сапраўднасць дакументаў з ЭЛП, якія прыйшлі ў Беларусь з іншых краін.

Тэлефонная «сімка» з ЭЛП і мадэрнізацыя комплексу «Адно акно»

У гэты ж перыяд з'явілася **паслуга электроннага лічбавага подпісу на СІМ-картцы.** Паколькі многія юрыдычна значныя дзеянні людзі здзяйсняюць праз мабільны, зручным носьбітам ЭЛП стала спецыялізаваная СІМ-картка. Сёння падобныя прадукты з падтрымкай функцыі ЭЛП выпускаюць мабільныя аператары А1 і МТС.

— У 2017-м, каб аўтаматызаваць работу спецыялістаў службы «Адно акно», укаранілі **праграмны комплекс «Адно акно»,** у якім рэалізавана 210 адмінпрацэдур для фізічных асоб. ПК «Адно акно» патрэбны, каб максімальна аўтаматызаваць і алічбаваць ланцужок узаемадзеяння па ажыццяўленні адмінпрацэдур на ўсіх этапах: падача заявы, прымацаванне дадатковых дакументаў, накіраванне дадатковых запытаў у рамках працэдуры, перанакіраванне заявы ў іншы орган на выкананне, прыняцце адміністрацыйнага рашэння і фіксацыя яго ў праграмным комплексе, — паясніла Святлана Караневіч.

У гэты ж час адкрываюцца **першыя 36 пунктаў аказання паслуг Дзяржаўнай сістэмы кіравання адкрытымі ключамі праверкі ЭЛП** (ДзяржСКАК). Дагэтуль было толькі адно такое месца ў сталіцы. Новыя пункты змяшчаюцца на базе прадпрыемстваў — рэгістрацыйных цэнтраў (іх 12), якія выконваюць функцыі павераных.

Ведамасны архіў і Сістэма ўніверсальнага доступу

За 2018—2020 гады на партале з'явілася больш як 150 новых электронных паслуг і звыш 60 адмінпрацэдур. У гэты ж час запускаецца **анлайн-сэрвіс па дыстанцыйнай выдачы сертыфіката ЭЛП.** Ён дазваляе чалавеку, які ўжо атрымаў ключ, падаўжаць яго дзеянне без асабістай прысутнасці ў пункце аказання паслуг, праз партал дзяржпаслуг анлайн.

— Запускаюцца таксама **паслугі «Ведамасны архіў»,** — падзялілася прадстаўніца НЦЭП. — Летась быў прыняты Указ № 188, згодна з якім да чэрвеня бягучага года кожная арганізацыя, якая з'яўляецца крыніцай камплектавання дзяржархіваў, абавязаная наладзіць у сябе архіўнае захоўванне дакументаў і падключыцца (калі яна да гэтага не выкарыстоўвала ніякі іншы прадукт) да АІС «Ведамасны архіў».

З'явілася і інфармацыйная сістэма «Універсальная сістэма доступу» (УСД), якая падтрымлівае ў тым ліку ідэнтыфікацыю асобы па мабільным лічбавым подпісе.

У гэты ж перыяд Цэнтр становіцца **аператарам нацыянальнага сегмента інтэграванай інфармацыйнай сістэмы ЕАЭС.** У межах ЕАЭС існуе адзіная інфармацыйная сістэма, а ў кожнай з краін ЕАЭС існуе нацыянальны сегмент дадзеных сістэмы. Гэта трэба, каб рэалізоўваць у межах згаданай прасторы ў электронным выглядзе агульныя працэсы, якія пачынаюцца на тэрыторыі адной краіны, а завяршаюцца — на тэрыторыі іншай.

Абноўлены асабісты кабінет і планы на будучыню

У сучасны перыяд работы Цэнтра (2021—2023) выдаецца мільённы ключ ЭЛП і ажыццяўляецца лічбавы подпіс на ID-картцы. Таксама запускаецца мадэрнізаваны адзіны партал электронных паслуг і абнаўляецца асабісты кабінет. У апошнім становіцца магчымая аўтарызацыя па ID-картцы, з'яўляецца асабісты рахунак, з якога можна аплачваць электронныя паслугі і адміністрацыйныя працэдуры банкаўскай карткай, а не праз АРІП.

Ствараецца Адзіная сістэма ідэнтыфікацыі юрыдычных і фізічных асоб (АС ІЮФА). З ёю абавязаныя інтэгравацца сістэмы, якія ствараюцца і для работы з якімі патрэбна строгая (у тым ліку з выкарыстаннем ID-карткі) аўтарызацыя. Пачынаецца будаўніцтва новага будынка Цэнтра.

У далейшым будуць удасканальвацца механізмы ідэнтыфікацыі і адбудзецца спрашчэнне. З'явіцца мабільная праграма, якая дазволіць выкарыстоўваць ID-картку як сродак ідэнтыфікацыі без прымянення счытвальніка да яе. Своеасаблівым счытвальнікам стане мабільны тэлефон з убудаваным у яго NFC-модулем, які і дазволіць аўтарызавацца на адзіным партале. Гатовы прадукт прадставяць на выстаўцы ТІБО ў красавіку.

Яшчэ больш працэдур будзе пераведзена ў электронны выгляд. Усё больш паслуг беларусам будзе аказвацца не кропкава, а шляхам аб'яднання іх у пэўныя модулі адпаведна жыццёвай сітуацыі, каб чалавек не шукаў назву патрэбнай яму адміністрацыйнай працэдуры на партале, а проста ўводзіў назву сваёй праблемы: «пераезд на новае месца», «нараджэнне дзіцяці» і іншае. І па такім запыце будзе выдавацца падборка электронных сэрвісаў, што могуць спатрэбіцца.

Будзе ўдасканальвацца і работа ПК «Адно акно», каб чалавек мог падаць заяву на атрыманне пэўнай паслугі не толькі фізічна, прыйшоўшы да аператара службы «Адно акно», а непасрэдна з адзінага партала.

Працуюць у Цэнтры і над аказаннем праактыўных паслуг (калі дзяржава сама будзе нагадваць чалавеку пра неабходныя дзеянні ў яго жыццёвай сітуацыі, напрыклад, што яму трэба стаць на чаргу ў садок ці што гатовы яго пашпарт).

Распрацоўваецца і механізм легалізацыі інфармацыі, атрыманай праз ААІС, каб ёй давяралі ў дзяржорганах. Цяпер трэба раздрукаваць атрыманую электронную інфармацыю і засведчыць яе. У будучым, магчыма, кожнаму такому дакументу пачне прысвойвацца ўнікальны нумар ці QR-код, па якім можна будзе праверыць сапраўднасць дакумента.

Ірына СІДАРОК.

НЦЭУ
АДЗІНЫ ПАРТАЛ ЭЛЕКТРОННЫХ ПАСЛУГ –
платформа для атрымання дзяржаўных паслуг і адміністрацыйных працэдур у электронным выглядзе
СТАНЬ ЛІЧБАВЫМ ГРАМАДЗЯНІНАМ
Адзіны партал аблегчыць жыццё кожнаму грамадзяніну, беларусу або замежніку – усім, хто хоча ўзаемадзейнічаць з дзяржавай без папяровай цяганіны і хаджэння па інстанцыях.
Падрабязней – на адзіным партале электронных паслуг
https://platform.gov.by

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

30 САКАВІКА 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 6 (15950)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Гурт «Чараўніцы»:

«Кожная з іх на сцэне — каралева»

У сённяшнім выпуску мы раскажам пра сапраўдных лясных фей, якіх у Беларусі называюць чараўніцамі. Нашы гераіні жывуць на сцэне і лічаць, што ім сапраўды ўласціва пэўная магія. Напрыклад, калі дзяўчаты выходзяць выступаць — спыняецца дождж, а сыходзяць — зноў пачынае ліць. Каб даведацца, у чым жа іх сакрэт, мы сустрэліся з кіраўніком легендарнага гурта «Чараўніцы» Палінай БАЗЫЛЕВАЙ. Яна прыйшла разам з Аленай ЦІЖ — вакалісткай ансамбля. Дзяўчаты падзяліліся з «Чырвонкай. Чырвонай зменай» кур'ёзнымі гісторыямі, расказалі пра традыцыі і прымхі, што пануюць у калектыве, пра мацярынскія клопаты і тыя самыя цуды падчас канцэртаў.

Гісторыя «Чараўніц» пачалася з 1971 года, калі ў гродзенскім ДК тэкстыльнага камбіната музыкант і вялікі аматар джаза Генадзь Лятынскі стварыў жаночы калектыў з выпускніц музычных вучылішчаў. Яго слава грымела на ўвесь Савецкі Саюз. Пасля вялікага поспеху ў «Чараўніц» здарыўся доўгі перапынак. Пра былое прызнанне прыходзілася толькі ўспамінаць. Колішняя кіраўніца калектыву Людміла Пасмурцава ўбачыла працяг сваёй справы ў асобе маладой салісткі Магілёўскай філармоніі Паліны Базылевай, якая трапіла ў калектыў ансамбля выпадкова ў 2011 годзе. Пайшла з мужам на вяселле знаёмых, там праспявала, і — Паліну заўважылі. А ў 2018 годзе дзякуючы дзяўчыне ансамбль пачаў новае жыццё.

«Век артысткі-вакалісткі не такі доўгі, — канстатуе Паліна. — Сцэна патрабуе маладых і амбіцыйных. Таму, калі старэйшыя за нас удзельніцы прынялі рашэнне завяршыць кар'еру, у 2018 годзе мы аб'явілі кастынг. Да нас прыйшла Анжаліка Зайцава, дарэчы, маці чацвярых дзяцей, а паўтара года таму ў склад увайшла Алена Ціж, таксама шматдзетная маці. Мы шукалі сапрана, а ў яе такі званочак — тое, што нам і трэба было» *(смяецца)*.

Раней, расказвае кіраўнік легендарнага гурта, каб трапіць у «Чараўніцы», трэба было адпавядаць тром крытэрыям: праспяваць актаўны скачок на песню «Не за вочы чорныя», не мець шырокую косць і пяць гадоў не нараджаць. Цяпер такіх правілаў няма. Напрыклад, тое, што Анжаліка — мама чацвярых дзетак, кіраўніка калектыву нікольк не спалохала, наадварот, натхніла. Паліна за тое, каб у кожнага былі і дзеці, і сям'я, так меркавала калісьці і Людміла Пасмурцава. Яна часта падтрымлівала дзяўчат, падстрахоўвала і нават заставалася з іх дзецьмі падчас гастроляў.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Лакацыі актыўнасці

«КАМАНДА БУДУЧЫНІ»

Маладзёжных лідараў дапамагае выхоўваць унікальны праект

Больш як 160 чалавек складаюць кадравы рэзерв, які ўдалося сфарміраваць за час рэалізацыі нацыянальнага праекта «Лідарская платформа «Каманда будучыні». Яго ідэя ўпершыню была агучана Маладзёжным парламентам пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь з трыбуны VI Усебеларускага народнага сходу. А першы набор адбыўся восенню 2021 года.

— У назве нашага праекта зашыфраваны сэнс — мы імкнёмся стварыць каманду будучыні, якая будзе ўвесь час пашырацца і прымнажацца, — расказвае **старшыня Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь Мікіта РАЧЫЛОЎСКІ.** — І тое, што наша ідэя была агучана з самай высокай трыбуны, накладае на нас вялікую адказнасць. Мы не маем права апускаць узнятую планку... У 2022 годзе лідарская платформа «Каманда будучыні» стала пераможцам рэспубліканскага конкурсу маладзёжных ініцыятыў, а ў 2023 годзе ўключана ў рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні Года міру і стваральнай працы.

Мы кансалідавалі вакол сябе самую актыўную і неабыякавую моладзь. Узрост удзельнікаў праекта — ад 18 да 35 гадоў. Наша мэта — пошук сацыяльна актыўных маладых людзей, навучанне іх тэарэтычным і практычным навыкам у сферы лідарства і дзяржаўнага кіравання, стварэнне камунікацыйнай пляцоўкі для абмену досведам і распаўсюджвання найлепшых практык.

Адбылося ўжо пяць набораў у праект. Дарэчы, пяты набор атрымаўся самым «дарослым» і, напэўна, самым цікавым у плане жыццёвага і прафесійнага вопыту яго ўдзельнікаў. Старт навучанню ўдзельнікаў пятага набору быў дадзены 11 сакавіка на базе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Яго арганізатарамі выступаюць Маладзёжны парламент, Цэнтр міжнародных даследаванняў факультэта міжнародных адносін БДУ, маладзёжнае грамадскае аб'яднанне «Рух наперад» і навукова-культурная ўстанова «Еўразійскае Партнёрства».

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Свой стыль

Харызматычная, крэатыўная, разумная і таленавітая

За званне найлепшай змагаліся 12 студэнтак

Днямі ў Спартыўна-культурным цэнтры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў было шматлюдна: там праходзіў фінал XXXI Міжнароднага конкурсу прыгажосці і таленту «Каралева студэнцтва — 2022». Арганізатарамі выступілі Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Расійскі саюз моладзі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Беларусі і Нацыянальнай школы прыгажосці.



...Апошнія музычныя рэпетыцыі перад стартам шоу, гледачы, якія паступова запаўняюць трыбуны, і канкурсанткі, што рыхтуюцца да выхаду на сцэну ў грымёрцы... А яшчэ — прыгажосць: яна літаральна лунала ў паветры. Менавіта такая атмасфера і панавала ў зале перад мерапрыемствам...

У фінальным шоу ўзялі ўдзел 12 канкурсантак: па шэсць ад Беларусі і Расіі. Трэба адзначыць, што для гэтага ім прыйшлося прайсці зусім няпросты шлях. Напрыклад, на выхад у паўфінал ад беларускага боку прэтэндавала 370 студэнтак. Адборачныя туры адбыліся ў 44 установах вышэйшай адукацыі, паўфіналы — у пяці абласных цэнтрах і Мінску. Каманда фіналістак была сфарміравана канчаткова пасля рэспубліканскага конкурсу грацыі і таленту «Каралева студэнцтва — 2022».

Пасля канцэптуальнага пралогу «Адлюстраванне сапраўднай каралевы» мы нарэшце ўбачылі саміх канкурсантак. Яны ўпэўнена дэфіліравалі па сцэне ў яркіх кактэйльных сукенках. Але ж проста знешняй прыгажосці недастаткова. Сапраўдная каралева павінна быць харызматычнай, крэатыўнай, разумнай і таленавітай. Менавіта гэтыя якасці і былі патрэбны канкурсанткам, каб годна прадставіць творчы нумар. Адным з самых яркіх стала выступленне Ганны Івановай, студэнткі трэцяга курса факультэта эканомікі і бізнес-кіравання Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Яна выканала народны танец на сучасны манер. Гледачы былі ў захапленні.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
30 03 2023 г.

«КАМАНДА БУДУЧЫНІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Усяго на пяты набор прыйшлі 142 заяўкі. Адабраць з іх 40 найбольш актыўных маладых людзей на падставе запоўненых анкет было вельмі няпроста, — канстатуе **старшыня НКУ «Еўразійскае Партнёрства» Аляксей ТОМА.** — Таму для фарміравання магутнай каманды мы імкнуліся захаваць пэўны баланс — адбіралі прадстаўнікоў ад кожнай ВНУ, арганізацыі і кожнага горада, адкуль паступілі заяўкі....

Хачу падкрэсліць, што «Каманда будучыні» — унікальны праект, аналагаў якому ў Беларусі няма. Мы навучаем моладзь soft skills — навыкам, абавязковым для сучаснага кіраўніка: публічных выступленняў, вербальнай камунікацыі, мастацтва вядзення дзелавых перагавароў і г. д. Больш за тое, на нашых мерапрыемствах мы ствараем сувязі паміж патрыятычна настроенай моладдзю. Вучым іх працаваць у камандзе, чуць адзін аднаго, таму што толькі ў адзінстве можна дасягнуць пастаўленых мэт. Атрыманы ўдзельнікамі праекта досвед, навыкі і знаёмствы дапамагаюць ім стаць на галаву вышэй саміх сябе і падзяліцца потым гэтым досведам з іншымі.

«Наша мэта — пошук сацыяльна актыўных маладых людзей, навучанне іх тэарэтычным і практычным навыкам у сферы лідарства і дзяржаўнага кіравання, стварэнне камунікацыйнай пляцоўкі для абмену досведам і распаўсюджвання найлепшых практык».

З кожным наборам праграма і мерапрыемствы праекта ўдасканальваюцца, на іх запрашаюць ганаровых і ўнікальных гасцей. Па стане на сакавік бягучага года было арганізавана ўжо 19 мерапрыемстваў у рамках лідарскай платформы «Каманда будучыні». Яны праводзіліся на пляцоўках БДПУ, Мінскай гарадской ратушы, факультэта міжнародных адносін БДУ, ААТ «БелАЗ», Белтэлерадыёкампаніі, тэлеканала СТБ, Выканкама СНД і прэс-цэнтра Савета Рэспублікі.

Удзельнікаў кожнага набору чакаюць чатыры насычаныя мерапрыемствы. На занятках юнакі і дзяўчаты атрымліваюць тэарэтычныя веды і практычныя навыкі

ў сферы лідарства і дзяржаўнага кіравання, а напрыканцы навучання прэзентуюць уласныя праекты.

Першы трэнінг, як правіла, прысвечаны майстэрству публічных выступленняў і вядзення дэбатаў. Падчас бліц-дэбатаў абмяркоўваюцца актуальныя тэмы знешняй і ўнутранай палітыкі. Гэта могуць быць самыя розныя пытанні, напрыклад, удзел Беларусі ў міратворчых аперацыях за мяжой, змяненне сістэмы падаткаабкладання для розных сацыяльных груп, перспектывы ўвядзення адзінай валюты ў Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі, пераход на лічбавыя рублі і адмена наяўных грошай, актуальнасць прымянення цэнзуры ў сацыяльных сетках, мараторый на смяротнае пакаранне і г. д.

Другое мерапрыемства пятага набору прайшло на базе факультэта міжнародных адносін БДУ. Для яго ўдзельнікаў быў арганізаваны трэнінг па майстэрстве невербальнай камунікацыі. А затым адбылася дзелавая гульня «Мадэль ЕАЭС», дзе можна было прымяніць на практыцы атрыманыя навыкі. Маладыя лідары былі падзелены на пяць каманд, кожная з якіх прадстаўляла краіну ЕАЭС. У рамках мадэлі ўдзельнікі вырашалі задачы па знешняй палітыцы саюза. Дарэчы, Белдзяржуніверсітэт традыцыйна моцна прадстаўлены ў праекце: у пятым наборы развіваюць свае «скілы» студэнты юрыдычнага, эканамічнага факультэтаў і факультэта міжнародных адносін.

— Вельмі яскравае і эмацыянальнае мерапрыемства — трэнінг па майстэрстве выступлення на камеру і ўдзел у ток-шоу. Узважана адстойваць свой пункт гледжання пры дэфіцыце эфірнага часу — асаблівае ўменне, — падкрэслівае Мікіта Рачылоўскі. — Калі твой апанент перахапіў ініцыятыву, то камера будзе засяроджана толькі на ім. Увогуле, вельмі важна навучыцца выгадна выступаць на камеру пры любых абставінах, пазіцыянаваць сябе, таму што лідар грамадскай думкі павінен пастаянна прысутнічаць у інфармацыйным полі.

Падчас ток-шоу вядучы не проста накіроўвае ўдзельнікаў, але і спрачаецца з імі, задае правакацыйныя пытанні. Задача ўскладнена тым, што ўсё адбываецца ў рэжыме прамой трансляцыі: права на памылку няма.

Фінальная кропка ў навучанні — прэзентацыя і абарона праекта па паляпшэнні і развіцці краіны. Так бы мовіць, «дыпломны праект», сведчанне, што маладому чалавеку ёсць што сказаць і ёсць што прапанаваць. Іх ідэі могуць тычыцца сацыяльнай сферы, удасканалення заканадаўчай дзейнасці, сферы інфармацыйных тэхналогій, маладзёжнай палітыкі і г. д.

— Калі мы збіраем у адным месцы столькі прыгожых, разумных, актыўных і мэтанакіраваных маладых людзей, то ў гэтым асяроддзі абавязкова што-небудзь народзіцца, — разважае Аляксей Тома. — Галоўнае, што праект стаў цэнтрам прыцягнення для маладых лідараў. Гэта вынік сур'ёзнай камандной работы.

Унікальнасць праекта яшчэ і ў тым, што для ўсіх яго ўдзельнікаў навучанне бясплатнае. Між іншым, праект суправаджаюць прафесійная фота- і відэаздымка, у якасці спікераў запрашаюцца лідары грамадскай думкі, журналісты і тэлевядучыя. Свае дзверы перад удзельнікамі расчыняюць сур'ёзныя арганізацыі, установы і прадпрыемствы, сярод іх — Выканаўчы камітэт СНД, Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу, ААТ «БелАЗ» і іншыя.

— Гэта насамрэч унікальны праект. Падпісваюся пад кожным словам, — кажа **ўдзельнік трэцяга набору Дзмітрый МУРАВЕЙНІКАЎ.** — «Каманда будучыні» дапамагае расці, гэта эфектыўны інструмент для прафесійнага развіцця нашай моладзі. Я асабіста даведаўся аб ім выпадкова з сацыяльных сетак і адразу падаў заяўку. Праект даў мне вельмі шмат: асабліва хочацца адзначыць лекцыі па публічнай дыпламатыі, прамоўніцкім майстэрстве і новыя знаёмствы, бо для маладога чалавека вельмі важна знайсці аднадумцаў, з якімі можна рушыць далей. Асабіста мне бліжэй за ўсё фармат дэбатаў. Яны дапамагаюць развіваць крытычнае мысленне, навыкі прамоўніцкага майстэрства, уменне аргументавана адстойваць сваю пазіцыю. Гэта ўсё вельмі важна не толькі для дыпламатаў, але і для дзяржаўных служачых, таму што ўсё ў нашым жыцці — гэта перагаворы, а дэбаты вучаць, як правільна даносіць сваю пазіцыю. Вельмі проста крычаць і крытыкаваць, а вось аргументавана адстойваць сваю думку можа далёка не кожны. Да таго ж удзел у праекце — выдатная магчымасць зарэкамендаваць сябе.

Мікіта Рачылоўскі анансаваў, што арыенціровачна ў кастрычніку бягучага года будзе аб'яўлены новы набор у «Каманду будучыні».

«Каманда будучыні» — унікальны праект, аналагаў якому ў Беларусі няма. Мы навучаем моладзь soft skills — навыкам, абавязковым для сучаснага кіраўніка: публічных выступленняў, вербальнай камунікацыі, мастацтва вядзення дзелавых перагавароў і г. д.»

Мікіта Рачылоўскі ўдакладніў, як узаемадзейнічаюць з найбольш актыўнымі і амбіцыйнымі выпускнікамі «Каманды будучыні»:

— Яны трапляюць у наш кадравы рэзерв. Мы з імі заўсёды на сувязі, запрашаем і рэкамендуем іх для ўдзелу ў розных праектах і мерапрыемствах для таго, каб яны актыўна працягвалі працаваць з моладдзю.

— Каб ваша анкета выглядала больш выйгрышна і не засталася незаўважанай, патрабуецца добрае партфоліа, — раіць ён. — Мы, калі бачым вакол сябе таленавітых людзей, імкнёмся іх падтрымаць, таму далучайцеся ўжо сёння да тых мерапрыемстваў, што праводзяцца Маладзёжным парламентам пры Нацыянальным сходзе, Цэнтрам міжнародных даследаванняў БДУ і навукова-культурнай установай «Еўразійскае Партнёрства». Сачыце за нашымі афіцыйнымі акаўнтамі ў сацыяльных сетках. Будзем знаёміцца, кантактаваць і рушыць далей разам. Таксама мы адкрыты для партнёрства, таму, калі ёсць ідэі, як наш праект далей развіваць і маштабіраваць, каб ён станавіўся яшчэ больш глабальным, рознабаковым і цікавым для моладзі, будзем рады ўсім прапановам.

Трэба дадаць, што сам Мікіта Рачылоўскі быў удзельнікам першага набору конкурсу «Каманда будучыні», а старшыня камісіі па міжнародных справах Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь Аліна Рацькова — удзельніца другога набору.

Надзея НІКАЛАЕВА, фота з сацыяльных сетак.

Камертон настрою

ЗАЗІРНУЦЬ НА ТВОРЧУЮ «КУХНЮ» ЛІТАРАТАРАЎ...

...Такая магчымасць будзе ва ўдзельнікаў Школы юнага пісьменніка XXI стагоддзя, якая пройдзе на філалагічным факультэце БДУ з 8 красавіка да 13 мая.

Для мерапрыемства абраны вочна-дыстанцыйны фармат. Курс накіраваны на развіццё ў школьнікаў творчага патэнцыялу, стварэнне платформы аднадумцаў, а таксама дапаможа будучым абітурыентам пазнаёміцца з дзейнасцю і спецыяльнасцямі філалагічнага факультэта.

Прыняць удзел у Школе змогуць юныя пісьменнікі з усіх рэгіёнаў краіны. Іх чакаюць майстар-класы ад сучасных пісьменнікаў, курс «Асновы пісьменніцкага майстэрства», трэнінгі па мастацкай творчасці ў розных жанрах (верш, комікс, метараман, драматызаваная паэма і інш.), абмеркаванне твораў вучняў, знаёмства з «прафесійнымі сакрэтамі» паэтаў, празаікаў, драматургаў і літаратурных крытыкаў.

Для ўдзельнікаў вочнага фармату навучанне будзе праводзіцца кожную другую суботу месяца. Працягласць заняткаў — чатыры акадэмічныя гадзіны. Юныя пісьменнікі з далёкіх рэгіёнаў Беларусі змогуць вучыцца дыстанцыйна. Фармат мае на ўвазе самастойнае знаёмства з дыдактычнымі матэрыяламі. Іх навучэнцы атрымаюць па электроннай пошце.

Каб стаць вучнем Школы юнага пісьменніка, неабходна запоўніць форму рэгістрацыі на сайце філалагічнага факультэта ўніверсітэта, даслаць свае творы, калі яны ёсць (паэзія, проза ці драматургія), на наступны электронны адрас: tvor@bsu.by. Для наведвання вочных заняткаў бацькам (законным прадстаўнікам) трэба дадаткова запоўніць заяву на папяровым носьбіце і перадаць куратару-валанцёру школы.

Вучням, якія паспяхова пройдуць навучанне ў Школе юнага пісьменніка, будуць уручаны пасведчанні.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Харызматычная, крэатыўная, разумная і таленавітая

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Вельмі крануў нумар Веранікі Лукашэвіч, студэнткі другога курса факультэта дашкольнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Гэта была інсцэніроўка балю канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Сваё выступленне дзяўчына завяршыла невялікім маналогам:

— Ва ўсе часы любоў і прыгажосць былі тымі пачуццямі, якія, акрыляючы сэрцы людзей, дапамагалі ім у самых складаных сітуацыях. Так склалася ў маім жыцці, што я расла без бацькоў, але менавіта гэтыя пачуцці дапаможа мне прайсці скрозь усе нягоды майго дзяцінства.

Самым незвычайным было выступленне Айыны Пудавай, студэнткі трэцяга курса Інстытута псіхалогіі Паўночна-Усходняга федэральнага ўніверсітэта імя М. К. Амосава. Гэта было сапраўднае этнічнае шоу — з маналогам на якуцкай, завываннем звяроў і ігрой на нацыянальным інструменце. І ўсё гэта ў выкананні адной дзяўчыны.

Далей было яшчэ некалькі разнапланавых дэфіле ў нацыянальных і дзелавых касцюмах, а таксама ў вячэрніх сукенках. Усе дзяўчаты былі вельмі прыгожыя, кожнай пасаваў абраны строй.

А яшчэ ў праграме быў конкурс прамоўніцкага майстэрства «Люстэрка». Асабліва спадабалася, як гэту тэму інтэрпрэтавала Дар'я Аліструва, студэнтка другога курса факультэта мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Яна пачала сваё выступленне з таго, што ў кожнай жанчыны ёсць асаблівы мужчына, які, нібы люстэрка, паказвае яе ўнутраны свет. Магло падацца, што цяпер пачнецца рамантычны аповед, але не. Для Дар'і асаблівы мужчына — яе тата. Яна прыгадала, як ён у дзяцінстве катаў яе на шыі, як яны разам ездзілі ў лес, як бацька вучыў яе плаваць.

«Тата, твае вочы — маё люстэрка, дзякуючы табе я ўбачыла сябе сапраўднай», — гучаў голас Дар'і. Але самой дзяўчыны ўвесь гэты час не было на сцэне. Пры гэтым усе чулі яе словы і бачылі субцітры на экране. У чым справа, куды знікла канкурсантка?

Усё стала на свае месцы ў канцы нумара, калі ўсе пачулі: «Тата, павярніся, я побач». Сафіты падсвятлілі частку глядзельнай залы, і ўсе ўбачылі Дар'ю з букетам кветак, якая абдымалася са сваім бацькам.

…Самым напружаным момантам, вядома, было абвяшчэнне вынікаў: хто ж стане «Каралевай студэнцтва — 2022»? Пасля шэрагу раздадзеных узнагарод мы нарэшце даведаліся, што гэты тытул атрымала Айыына Пудава, студэнтка трэцяга курса Інстытута псіхалогіі Паўночна-Усходняга федэральнага ўніверсітэта імя М. К. Амосава. «Віцэ-каралевай студэнцтва — 2022» стала Ганна Іванова, студэнтка трэцяга курса факультэта эканомікі і бізнес-кіравання Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. А тытул «II Віцэ-каралева студэнцтва — 2022» падзялілі паміж сабой Арыяна Гайнуліна, студэнтка чацвёртага курса гуманітарнага факультэта Табольскага педагагічнага інстытута імя Д. І. Мендзялеева, і Паліна Шыркова, студэнтка другога курса магістратуры будаўнічага факультэта Варонежскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта. А «Каралевай студэнцтва online» стала Наталля Папко, студэнтка чацвёртага курса лячэбнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

Лізавета ГОЛАД,
фота аўтара.

Занятак па душы

САКРЭТЫ КАСЦЮМА І ГРЫМУ,

або Сыграць любімага персанажа

Касплей — рух адносна малады, які бярэ свае вытокі з пачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя. Але прыкметнай і папулярнай гэта культура стала са з'яўленнем інтэрнэту. Праўда, нават нягледзячы на такі ўсплёск увагі, у большасці з тых, хто чуў аб касплеі, існуе стэрэатып, што ім займаюцца пераважна падлеткі, папросту марнуючы час і сродкі. Развеяць гэтае меркаванне гатова ўдзельніца і пераможца касплей-конкурсаў Беларусі і краін СНД 32-гадовая мінчанка Карына КАРОЛЬ.

— Гісторыя, як я трапіла ў гэты кірунак, такая. Усё пачалося з першых анімэ, якія трансліраваліся ў 2000-х гадах на МузТБ і MTV. Тады яны зачапілі сваім сюжэтам і незвычайнай манерай малявання. Далей знайшліся аднадумцы, якія пазнаёмілі мяне з фестывалямі па анімэ-традыцыі. Тады я яшчэ не ведала, што канкрэтна ўяўляюць сабой такія мерапрыемствы, і мне вельмі хацелася на іх трапіць, каб пазнаёміцца з іншымі «сябрамі» па агульных інтарэсах, — прыгадвае суразмоўніца. — Першы раз паехала на фестываль «Хіган» у 2010 годзе. У той час ён праходзіў два разы на год! На мерапрыемстве была праграма з рознымі конкурсамі, выставамі мастацкіх работ і выступленні саміх удзельнікаў. Людзі на сцэне прадстаўлялі нумары, дзе дэманстравалі персанажаў з анімэ. З кожным новым фестывалем мне ўсё больш хацелася выступаць і рабіць касцюмы, як тыя хлопцы і дзяўчаты. І мяне зацягнула, я стала спрабаваць сябе ў ролі касплейшчыка. На працягу ўсяго майго шляху ў гэтым кірунку я шматразова ўдзельнічала ў фестывалях у Мінску, Гомелі, Маскве і Санкт-Пецярбургу.

У гэтай сферы Карына ўжо 12 гадоў. Родныя спачатку былі не вельмі рады яе захапленню, бо лічылі, што касплей — дзіцячы занятак, які марнуе час і грошы. А зараз, наадварот, лічаць, што гэта крута! Затое сябры адразу яе падтрымалі...

На пытанне, наколькі ж затратнае захапленне, Карына адказвае, што, як і любое іншае хобі, яно каштуе грошай. Гарнітуры могуць быць рознай складанасці і па-рознаму могуць абыходзіцца матэрыялы. Калі браць грашовы эквівалент — ад 300 долараў і вышэй. Вядома, акрамя сродкаў, сыходзіць шмат сіл, каб увасобіць у жыццё нейкі вобраз. Але, напрыклад, суразмоўніца сама можа пашыць гарнітур, што ў некаторым сэнсе з'яўляецца яе перавагай.

— Сярод увасобленых мной вобразаў ёсць самыя любімыя, іх два! Першы — светлы эльф з анімэ Records of Lodoss war («Летапіс Войн востраваў Лодас»). Другая любімая выява — гэта Жанна Д'арк з анімэ Fate/Apocrypha. Апошні самы складаны, бо, каб усё надзець для яго, патрэбна дапамога мінімум аднаго, а то і двух чалавек. Сыходзіць часу прыкладна гадзіны тры мінімум, пакуль макіяж нанясуць, зацягнуць у гарсэты, латы і парык. А было што і па восем гадзін...

Суразмоўніца лічыць, што ў апошні час істотна вырас не толькі ўзровень звычайных удзельнікаў, але і сяброўскіх супольнасцяў як у нашай краіне, так і па-за ёй. Вядома, узровень касплею ў краінах СНД і Еўропе сустракаецца і мацнейшы. Гэта звязана з тым, што шматлікія матэрыялы для стварэння вобраза, той жа парык, можна набыць толькі за мяжой.

— За ўвесь час майго захаплення касплеем я стараюся прымаць удзел у фестывалях і канвентах хаця б два разы на год, гэта ўжо для мяне як традыцыя. На жаль, апошнія пару гадоў, з-за пандэміі, актыўнасць упала, бо ўсё гэта мае на ўвазе кантакты людзей. Але нават у гэты няпросты час людзі спрабуюць ствараць прыгажосць і ўдзельнічаць у розных конкурсах анлайн або дыстанцыйна, — гаворыць Карына.

Пачаткоўцам яна хоча пажадаць не баяцца і спрабаваць. «Па сабе ведаю, што не заўсёды выходзіць першы раз выдатна, але трэба не спыняцца, галоўнае — верыць у сябе і свае сілы! А вось ад дэдлайну засцерагаю, лепш аціце сілы і падрыхтуйцеся грунтоўна, каб усё паспець!»

Анастасія САШЧЭКА,
вучаніца 8 класа
СШ № 36 г. Мінска,
фота дадзена гераіняй.

Не вучобай адзінай

Найлепшыя практыкі ў медыясферы

БДУІР заняў першае месца на расійска-беларускім форуме студэнцкіх СМІ «Індустрыя медыя». Форум прайшоў у Пскове. У ім узялі ўдзел больш за 100 прадстаўнікоў маладзёжных універсітэцкіх медыя з 20 расійскіх і беларускіх ВНУ.

БДУІР на форуме прадставілі начальнік прэс-службы ўніверсітэта Раман Роль і студэнты з каманды Маладзёжнага тэлебачання Аляксей Прохарчык, Дзмітрый Валасюк, Ганна Ларчанка, Ірына Шыкалава і Ларыса Лашкевіч.

У рамках медыяфоруму былі праведзены стратэгічныя сесіі, прысвечаныя рэалізацыі сумесных адукацыйных і інфармацыйных праектаў. На іх ВНУ абмяняліся найлепшымі практыкамі ў сферы медыя.

Начальнік прэс-службы БДУІР Раман Роль прадставіў на форуме праграму супрацоўніцтва ўніверсітэта і Беларускай праваслаўнай царквы ў digital-сферы.

Для студэнтаў былі праведзены круглыя сталы і майстар-класы, а таксама экскурсіі па знакавых гістарычных мясцінах на Пскоўшчыне. Асноўнай задачай каманд на працягу трох дзён была распрацоўка суполак у сацыяльных сетках.

Некаторыя каманды развівалі існуючыя студэнцкія медыя, а частка, у тым ліку і БДУІР, працавалі над новымі. Эксперты пры ацэнцы праектаў удзялялі ўвагу крэатыўнасці кантэнту і зладжанасці работы хлопцаў і дзяўчат.

У выніку першае месца на форуме занялі студэнты БДУІР і студэнты з Мардоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. П. Агарова. Пераможцы хутка адправяцца ў Казань — у прэс-тур ад Міністэрства навукі і вышэйшай адукацыі Расіі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПЛЕЯДА МАЛАДЫХ

У КАРАБЛЯ «РУДАКОВА» МАЛАДЫ КАПІТАН

Дырэктар буйнога сельгаспрадпрыемства «Гэты рух я і люблю, хапае энергіі і азарту»

Віцебскага раёна Андрэй БЯНЬКО:

ХТО сказаў, што сельская гаспадарка — справа толькі дарослых людзей, якія маюць за плячыма багаты вопыт і літаральна нарадзіліся для працы на зямлі? Аграрная галіна нашай краіны сёння — гэта мадэрнізаваныя агрэгатамрысловыя холдынгі, рабатызаваныя жывёлагадоўчыя комплексы і сучасныя тэхналогіі вытворчасці. Новы подых у развіццё гэтай сферы ўносяць, вядома, прадстаўнікі маладога пакалення — апантаныя, з незгасальным запалам і жаданнем зрабіць найлепш. Сярод паспяховых маладых кіраўнікоў — дырэктар унітарнага прадпрыемства «Рудакова» Андрэй БЯНЬКО з Віцебскага раёна.
Пра кіраванне адным з найбуйнейшых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Віцебшчыны, рэалізацыю юнацкіх мар, а таксама працоўны гумар ад дырэктара — у чарговым выпуску праекта «Плеяда маладых».

— Андрэй Аляксандравіч, вам толькі 29 гадоў, а вы ўжо ўзначальваеце адну з найвялікшых гаспадарак паўночнага рэгіёна. Наколькі доўгі быў прафесійны шлях?

— Я прыйшоў у «Рудакова» ў 2017 годзе па размеркаванні. Пачаў пісаць свой працоўны летапіс на пасадзе загадчыка машыннага двара, потым стаў галоўным інжынерам. З цягам часу атрымаў павышэнне да намесніка па механізацыі, пасля — намесніка дырэктара па вытворчасці. Са снежня мінулага года афіцыйна ўзначальваю наш віцебскі сельскагаспадарчы «карабель» (*усміхаецца*).

— Абралі прафесію выпадкова або працягваеце сямейную дынастыю?

— Мой лёс быў прадвызначаны. Я родам з Сенненшчыны, аграгарадка Літусова. Мой бацька быў галоўным аграномам у мясцовай гаспадарцы, маці і зараз працуе загадчыкам зернесушыльнага склада. Адна справа — калі ты жывеш у вёсцы і з дзяцінства далучаешся да працы на зямлі, а другая — калі твае бацькі спецыялісты ў гэтай галіне. І я заўсёды ведаў, што мой жыццёвы шлях адзін — сельская гаспадарка. У 12 гадоў я ўжо выдатна кіраваў машынай, разбіраўся ў тэхніцы — усе гэтыя асновы даў мне бацька. Напэўна, тады і зарадзілася любоў да агрэгатаў і тэхнікі, таму і адукацыю атрымліваў у Беларускай дзяржаўнай сельгасакадэміі па спецыяльнасці «Механізацыя». Разам з гэтым адначасова атрымліваў спецыяльнасць па кіраванні для сябе. І, як паказалі гэтыя гады, недарма. Траліўшы ў Віцебскі раён, захацелася тут застацца — у «Рудакова» была моцная тэхнічная база, кіраўніцтва стварыла камфортныя ўмовы, гэтыя ўнутраныя традыцыі гаспадаркі мы захоўваем і ўдасканальваем і сёння.

— Што сабой зараз уяўляе «Рудакова»?

— Гэта чатыры вытворчыя ўчасткі на плошчы 30 тысяч гектараў, цяплічны камбінат, дзе развіваецца раслінаводства. Больш за 14 тысяч налічвае паголоўе буйной рагатай жывёлы, 15 тысяч гектараў раллі. На прадпрыемстве сёння працуе каля тысячы чалавек. Пры гаспадарцы ёсць кавярня-бар і гасцініца.

Пасля рэарганізацыі гаспадаркі з філіяла ААТ «Малако» г. Віцебска ва ўнітарнае прадпрыемства да нас далучыліся вытворчыя ўчасткі «Вымна» і «Паўдзеткі». У мінулым годзе ў структуру «Рудакова» ўвайшоў і ўчастак «Тулава».

Мы штодзень рэалізоўваем 60 тон малака вышэйшым гатункам або «экстра». На тэрыторыі раёна працуе дзесяць фірмавых крам, якія прапануюць спажыўцам свежую гародніну цяплічнага камбіната па цэнах з мінімальнай гандлёвай надбаўкай. Прадпрыемства забяспечвае гаспадаркі вобласці злітным насеннем (у 2022 годзе было рэалізавана 240 тон).

— Наколькі цяплічны камбінат з'яўляецца неад'емным элементам адзінага механізма?

— Камбінат — «сэрца» нашай гаспадаркі. Сама за сябе гаворыць эканамічная статыстыка: у мінулым годзе «Рудакова» заробіла 56 мільёнаў рублёў, з іх 28 — толькі цяплічны камбінат. Цяплічны — асноўны рухальнік агульнага прамысловага прагрэсу.

— За вялікімі дасягненнямі прадпрыемства заўсёды стаяць людзі, з маленькіх перамог якіх складаецца агульны вынік цэлага калектыву. Раскажыце аб сваіх «байцах» бачнага і нябачнага «фронту»?

— Без людзей, якіх упэўнена можна назваць прафесіяналамі сваёй справы, сёння прадпрыемства не магло б існаваць паспяхова. Яны штодзённай цяжкай працай закладвалі падмурак «Рудакова», фарміравалі моцныя аграрныя традыцыі і працягваюць іх сёння. Сярод заслужаных работнікаў, якія ўнеслі важкі ўклад у станаўленне, — начальнік вытворчага ўчастка «Паўдзеткі» Анатоль Віктаравіч Лісоўскі, начальнік вытворчага ўчастка «Вымна» Міхаіл Васільевіч Дуднік і шэраг іншых ветэранаў сельскай гаспадаркі.

Раіса Іванаўна Крупаціна — начальнік цяплічнага камбіната — у гэтым годзе адзначае прафесійны юбілей. У «Рудакове» яна працуе 50 гадоў! Менавіта з-пад яе лёгкай рукі цяплічная гаспадарка з'яўляецца перадавіком у вобласці, размяшчаецца на 18 «зашклёных» гектарах і сёння забяспечвае не толькі вобласць і краіну, але і суседнюю Расію свежай вітаміннай прадукцыяй: агуркамі, памідорамі, зелянінай.

У мінулым годзе Віцебшчына пабіла паўночны аграрны рэкорд, намалаціўшы звыш мільёна тон збожжа. Першая, другая і трэцяя тысячы тон золата палёў у вобласці былі ў заліку рудакоўскага хлебароба Валянціна Яшчанкі. Ён неаднойчы прымаў віншаванні ад кіраўніцтва вобласці, раёна і гаспадаркі на полі. І такіх апантаных, якія гараць сваёй справай, у нас шмат не толькі ў галіне раслінаводства, але і жывёлагадоўлі.

— Якія змены адбыліся ў «Рудакове» пад вашым кіраўніцтвам?

— Шмат зроблена ў вытворчых участках: у «Паўдзетках» пабудаваны новы хлеў, адзін рэканструяваны ў «Рудакове», у «Вымне» была пабудавана даільная зала. На большасці аб'ектаў працавала ўласная будаўнічая брыгада. Цяпер робім акцэнт на мадэрнізацыю цэнтра прадпрыемства — вытворчага ўчастка «Рудакова». Адсюль і славутыя вытокі малочных рэк — вынік удасканаленняў у сферы жывёлагадоўлі.

Сёлета за кошт рэспубліканскага бюджэту будуць мадэрнізаваны два вялікія жывёлагадоўчыя аб'екты: МТК-1200 і МТК «Добрына», што значна павялічыць вытворчыя магчымасці прадпрыемства. На гэта выдзелена 3,2 мільёна рублёў.

— Сёння аграрныя прафесіі набіраюць папулярнасць і выходзяць на новы ўзровень прэстыжу. Наколькі сельскагаспадарчыя спецыяльнасці ў межах вашай гаспадаркі прывабліваюць людзей?

— Варта адзначыць, што цэнтр «Рудакова» знаходзіцца ў аграгарадку Ноўка, які размяшчаецца ў непасрэднай блізкасці ад Віцебска. І ў параўнанні з гарадскімі зарплаты ў нашай галіне значна вышэйшыя. Гэта, безумоўна, нялёгкая праца, але і ацэньваецца яна высока — сярэдняя зарплата на прадпрыемстве складае 1,156 рубля, усё роўна мы маем патрэбу ў спецыялістах.

Нярэдкія выпадкі, калі работнікі з іншых устаноў, якія прыходзілі на ўборачны сезон падзарабіць, заставаліся ў нас — гэта паказчык узроўню арганізацыі працы, аплаты і ўмоў. Летась камбайнеры зарабілі за жніво больш за пяць тысяч рублёў.

Мы забяспечваем нашых спецыялістаў жыллём (нават тых, хто прыязджае на сезон), выдаём уласную прадукцыю раслінаводства.

— Як ідзе падрыхтоўка да сяўбы?

— На мехдварах рабочы працэс не спыняўся з восені: паставілі тэхніку на захаванне і адразу пачалі рамонт. Усе прычапныя агрэгаты — плугі, культыватары — былі нагатове ўжо да канца года. Цяпер ідуць апошнія моманты падрыхтоўкі да сезона імпартных пасяўных агрэгатаў (тэрміны затрымлівае пастаўка запчастак).

Сёння машынны парк прадпрыемства складаюць звыш 150 адзінак тэхнікі, сярод якіх 28 энергонасычаных трактароў. Парк рэгулярна абнаўляецца, у бягучым годзе было закуплена пяць адзінак, у тым ліку бульбаўборачны камбайн і машыны для абслугоўвання комплексаў жывёлагадоўлі.

Акцэнт у будучым пасяўным сезоне будзем рабіць на культуры, якія забяспечаць кармавую базу гаспадаркі. Толькі за мінулы год мы павялічылі пагалоўе на тысячу — цяпер трэба нарыхтаваць жывёлам якасны корм.

фота БелТА

— З якімі цяжкасцямі сутыкаюцца віцебскія аграрыі падчас праводжання палавых работ з улікам таго, што Віцебскі раён звычайна падыходзіць да сяўбы адным з апошніх?

— Адна з галоўных праблем для нас — малая контурнасць палёў у адрозненне ад Аршаншчыны, Міншчыны. Цяпер амаль уся тэхніка з прычапнымі агрэгатамі шыроказахопная, таму хмызнякі і кустоўе ствараюць пэўныя цяжкасці пры апрацоўцы глебы. Замінаюць і камяні — адгалоскі ледавіка.

Умовы надвор'я ў рэгіёне дазваляюць пачынаць сяўбу запознена. Толькі нядаўна канчаткова сышоў снег, тэхніка не можа прасунуцца і грязне. Зараз і вываз арганікі вядзецца з дапамогай буксіроўкі. Але надвор'е таксама падзіць для нас школу жыцця: падчас жніва няма часу на адпачынак, таму і шчыруем актыўна, па-перадавому.

— Андрэй Аляксандравіч, як у вас атрымліваецца разбірацца ва ўсіх сферах: раслінаводстве, жывёлагадоўлі, механізацыі?

— Гэта, вядома, цяжка, але калі ўзяўся — то цягні (*усміхаецца*). Тэарэтычную базу я атрымаў у акадэміі, а адточваў і прымяняў веды на практыцы, ужо прыйшоўшы ў гаспадарку, якая шэсць гадоў назад была даволі вялікай. Прыходзілася хутка ўключацца ва ўсе вытворчыя працэсы, шматлікія рэарганізацыі закраналі і мяне. Гэта было каштоўным вопытам, бо, калі непадрыхтаваны чалавек прыходзіць на шматгаліновае прадпрыемства, ён губляецца. А мне пашанцавала працэсу гэта павольна на працягу пэўнага прамежку часу.

— Як да маладога дырэктара ставяцца работнікі?

— З павагай. Я год за годам напрацоўваў аўтарытэт, і мой калектыў цяпер давярае не лічбам у пашпарце, а рацыянальнаму, гаспадарскаму падыходу да справы. Я малады, але неабдуманых парывы юнацкага максімалізму перарос даўно (*усміхаецца*). У рабоце з людзьмі таксама не гляджу на ўзрост: калі спецыяліст на аб'екце працуе добра — малайчына, так трымаць; калі дзесьці недахоп — атрымай і выправі. А як паіншаму?

— Хто вас падтрымлівае і натхняе?

— Мая любімая сям'я. Сваю жонку Надзею я ведаю, здаецца, усё жыццё: яна часта прыязджала ў Літусова, дзе я жыў, да бабулі. Рамантычная вясковая атмасфера, як гэта часта здараецца, моцна паўплывала на нас, і юнацкае каханне перарасло ў сям'ю. А яшчэ адной маёй крынічцы натхнення ўжо тры гады — дачка Марыя ўжо ў мінулым годзе была са мной на полі падчас жніва. Разам з ёй увечары аб'язджаем аб'екты прадпрыемства, ёй падабаецца.

— Як звычайна праходзіць ваш дзень? Наўрад ці ў мяккім кабінетным крэсле?

— Раніцай бывае некалькі гадзін, каб разабрацца з вялікай колькасцю дакументаў. Звычайна займаюся гэтым у суботу. Пасля абеду саджуся ў аўтамабіль і пачынаю аб'язджаць фермы і мехдворы, каб паглядзець, як ідзе рамонт або як выконваюцца даручэнні.

Здаралася, што, калі на вытворчых участках не хапала спецыялістаў, я прыязджаў сам і паказваў работнікам, што і як трэба зрабіць. Летам падчас уборачнай на палях кантралюю рабочы працэс, сачу, каб механізатары не адыходзілі ад аховы працы, каб камбайны стаялі пад аховы. На маёй пасадзе трэба быць універсальным.

— Напэўна, і боты гумавыя за пяць гадоў сталі неад'емным элементам гардэробу?

— У мяне нават дзве пары ў дзвюх машынах. І зменныя куртки таксама. Працоўны дзень непрадказальны, як і надвор'е: заязджаю сядзіш на нарадзе, праз гадзіну — едзеш з аграномам на поле. Гэты рух я і люблю, хапае энергіі і азарту. Над паперамі пасяджу на пенсіі (*усміхаецца*).

— Вы жывяце ў сваім доме ў аграгарадку. Займаецеся зямляробствам у сябе на сотках?

— А як жа? Вясковую душу не вырвеш. У нас 22 сотні, на якіх і бульба, і градкі, і цыпляты. Усімі гэтымі справамі займаецца Надзея, а я падстаўляю сваё плячо ў пытаннях будаўніцтва ці рамонту. Апрацоўваю глебу таксама сам, на мотаблоку. І адразу адкажу на пытанне, якое вы не паспелі задаць: не тое, што мне хапае сельскай гаспадаркі на рабоце, проста сваё заўсёды найлепшае.

— Як праводзіце вольны час, калі такі выдаецца?

— Мая прафесія першапачаткова неафіцыйна падказвае, што вольнага часу багата не будзе. Яно так і здараецца, асабліва калі для цябе пасада дырэктара — не прыгожыя словы, а рэальная адказнасць. Хутка пачнецца сяўба, і мая сям'я будзе бачыць мяне толькі ўвечары, але я вельмі шаную неацэнны час бацькоўства і імкнуся ўсяго сябе прысвячаць дачцэ і жонцы.

Маім хобі, якое я прынёс амаль праз 30 гадоў жыцця, застаецца тэхніка. Люблю разбіраць і збіраць дэталі — гэта для мяне як асаблівы метад медытацыі і адпачынку.

— Якімі якасцямі павінен валодаць кіраўнік сельскагаспадарчага прадпрыемства?

— Чалавек павінен быць камунікабельным, у некаторай ступені — псіхолагам, слухаць людзей. Адначасова не страціць патрабавальнасць, умець крочыць у нагу з часам і выкарыстоўваць новыя тэхналогіі ў вытворчасці. І, вядома, без гумару нікуды — ён часам вырашае праблемы лепш за пагрозы.

— Азіраючыся назад, усе юнацкія мары спраўдзіліся?

— Так. У мяне ёсць сям'я, я рэалізаваўся ў прафесіі і атрымаў грамадскае прызнанне — па выніках работы за 2021 год маё імя занеслі на Дошку гонару Віцебскага раёна, захоўваю і граматы абласнога камітэта па сельскай гаспадарцы і прамысловасці. Аказаны давер з боку кіраўніцтва паўночнага рэгіёна імкнуся апраўдаць. Аднак толькі штодзённая карпатлівая праца дазволіць упэўнена рухацца наперад.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

Аўдыявэрсія праекта — на радыё Піпот-FM і на сайце zviazda.by.

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

1. Фирменное наименование эмитента
(полное наименование, включая организационно-правовую форму)

Открытое акционерное общество

«Лукомльэнергомонтаж»

Местонахождение эмитента
(индекс, почтовый адрес, телефон, факс (с междугородным кодом):
211162, Витебская обл., Чашникский р-н, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, д. 8, тел. 8 (02133) 60273

ИНФОРМАЦИЯ
об акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 1 января 2023 г.

4. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %) – 0.

Вид собственности	Количество акций, шт.	Доля в уставном фонде ,%
коммунальная, всего	0	0
В том числе	x	x

5-6. Информация о дивидендах и акциях:

Показатель	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Количество акционеров, всего	лиц	58	59
в том числе: юридических лиц	лиц		1
в том числе: физических лиц	лиц	58	58
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	тысяч рублей	18,10	
Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги)	рублей	2,38	
Обеспеченность акции имуществом общества	рублей	160,02	128,03
Количество акций, находящихся на балансе общества – всего	штук		52

7. Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества:

Показатель	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тысяч рублей	4908,00	7202,00
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию	тысяч рублей	4555,00	7297,00
Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (прибыль (убыток) отчетного периода)	тысяч рублей	315,00	-206,00
В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тысяч рублей	353,00	-95,00
прочие доходы и расходы по текущей деятельности	тысяч рублей		0,00
прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	тысяч рублей	-38,00	-111,00
Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	тысяч рублей	22,00	
Чистая прибыль (убыток)	тысяч рублей	293,00	-206,00
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	тысяч рублей	296,00	203,00
8. Среднесписочная численность работающих	человек	70	84

9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): **строительство трубопроводов – 92,21 %.**

10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой баланс за отчётный год: **24 марта 2023 г.**

Дата подготовки аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности: **15 марта 2023 г.**

Наименование аудиторской организации (фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется) индивидуального предпринимателя), местонахождение (место жительства), дата государственной регистрации, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей:
Общество с ограниченной ответственностью «Белросаудит»; 220020, г. Минск, пр. Победителей, 89, к. 3, пом. 4; 28.04.2000 г. № 600506719.

Период, за который производился аудит: **2022 г.**

Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской отчетности,а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской (финансовой) отчетности – сведения о данных нарушениях: **бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверна во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Лукомльэнергомонтаж» на 31.12.2022 г., а также финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств, за год, закончившийся на дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.**

Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном объеме: **24.03.2023 г. ЕПФР 13.** Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета) Эмитент следует положениям «Свода правил корпоративного поведения»: **свод правил корпоративного поведения – применяется.**

Директор П.В. Глазко

Гл. бухгалтер А.В. Круподер

УНП 300007839

Открытое акционерное общество
«Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»
(Республика Беларусь, 246008, г. Гомель, ул. Лещинская, 49)

сообщает, что годовым общим собранием акционеров данного общества, состоявшимся 23.03.2023, принято решение о выплате дивидендов по итогам 2022 года – 0 руб. 94 коп. на одну простую (обыкновенную) акцию.

Выплата дивидендов по акциям будет производиться с 24.03.2023 по 31.12.2023.

Порядок выплаты дивидендов акционерам: юридическим лицам – путем зачисления на их расчетные счета, физическим лицам дивиденды выплачиваются через кассу ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» или высылаются почтовым переводом (в пределах Республики Беларусь).

УНП 400078768

Извещение о проведении открытого аукциона
Организатор аукциона – Червенский районный исполнительный комитет

№ лота	Сведения о виде и предмете аукциона	Адрес объекта и его наименование	Срок аренды	Начальная цена объекта (рублей)	Сумма задатка (рублей)	Расходы по организации и проведению аукциона (рублей)	Ограничения (обременения) прав в использовании земель и другие ограничения
1	Аукцион на право аренды земельных участков	Земельный участок для строительства и обслуживания торгового павильона в д. Верхлес Смиловичского с/с, Червенского р-на, площадь – 0,02 га, кадастровый номер 625883500601000157	50 лет	7 150,0	715,0	2368,74 + расходы по размещению извещения в СМИ + возмещение потерь сельскохозяйственного производства в сумме 401,45	
2	Аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь	Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, расположенного по адресу: Минская область, Червенский район, г. Червень, ул. Тенистая, У-4, площадь – 0,15 га, кадастровый номер 625850100001003996		13245,00	1324,50	1965,38 + расходы по размещению извещения в СМИ	
3		Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, расположенного по адресу: Минская область, Червенский район, г. Червень, ул. Наровлянская, 40, площадь – 0,1312 га, кадастровый номер 625850100001003995		15258,56	1525,86	2036,08 + расходы по размещению извещения в СМИ	Охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 В – 0,0027 га; охранная зона линий, сооружений электросвязи и радификации – 0,0014 га, водоохранная зона пруда – 0,1312 га

Аукцион состоится **27 апреля 2023 года в 11.00** в здании Червенского райисполкома (зал заседаний) по адресу: г. Червень, пл. Свободы, 1.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в указанный срок подает: заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона; документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка. Кроме того, в комиссию представляются документы в соответствии с п. 11 Положения о порядке организации и проведения аукционов на право аренды земельных участков, п. 13 Положения о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность граждан, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 13.01.2023 года № 32. При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Червень, пл. Свободы, 1, райисполком, кабинет 69, тел. 80171428491 **по 25 апреля 2023 года включительно.**

Сумма задатка в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на расчетный счет BY94AKBB36410627000002600 0000 в ЦБУ 627 филиала № 500 МУ ОАО «АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 600008398.

Условия проведения аукциона – наличие не менее двух участников. При наличии единственного участника аукцион признается не состоявшимся. Единственный участник несостоявшегося аукциона в праве приобрести земельный участок за начальную цену с учетом 5 % к начальной цене этого земельного участка.

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«ПРИЗЫ В ПРИЛОЖЕНИИ КАТАЛОГ ONLINER 3»

1. Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

2. Сроки проведения рекламной игры: с 06.02.2023 по 17.04.2023 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения рекламной игры).

3. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4279, выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 19.01.2023.

4. Количество участников рекламной игры – 83 261 чел.

5. Информация о призовом фонде:

Размер призового фонда рекламной игры составляет 17655 (семнадцать тысяч шестьсот пятьдесят пять) белорусских рублей 15 (пятнадцать) копеек. Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

6. Информация о победителях рекламной игры:

№ п/п	Фамилия, инициалы победителя	Сведения о выигрыше
1.	Масловский С.А.	Приз (тур № 1) – iPhone 14 128 фиолетовый, денежные средства в размере 459,03 бел. руб.
2.	Волчкевич Д.А.	Приз (тур № 2) – iPhone 14 128 фиолетовый, денежные средства в размере 459,03 бел. руб.
3.	Сандаков С.Б.	Приз (тур № 3) – iPhone 14 128 фиолетовый, денежные средства в размере 459,03 бел. руб.
4.	Кулик Т.И.	Приз (тур № 4) – iPhone 14 128 фиолетовый, денежные средства в размере 459,03 бел. руб.
5.	Таран Е.К.	Приз (тур № 5) – iPhone 14 128 фиолетовый, денежные средства в размере 459,03 бел. руб.

7. Для получения приза победители должны явиться не позднее 17.04.2023 (включительно) по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2 этаж, предварительно связавшись с Организатором рекламной игры по номеру многоканального телефона: + 375 (29) 514 35 24.

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении **11 апреля 2023 года** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковский, д. 24, каб. 3-2

ЛОТ № 1: изолированное помещение с инв. № 300/D-678 площадью 960,7 кв. м, назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340100000001000921, площадью 0,1871 га (доля в праве 37/250); назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания многоквартирных жилых домов, встроенных изолированных помещений, не относящихся к жилищному фонду.
Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Привокзальная, 2 А-109

Начальная цена с НДС: **1 222 980,00** бел. руб.
Задаток (5 %) с НДС: **61 149,00** бел. руб.

Заключены договоры аренды с: РУП «Фармация» – до 24.09.2024 г.; ОАО «Белинвест Банк» – до 01.10.2023 г.; ООО «Городская сеть терминалов» – до 11.11.2023 г.; ИП Мишанина М.Н. – до 31.12.2023 г., ООО «ЕВРОТОРГ» – до 27.04.2027 г.

Продавец: ОАО «Табаквинторг», г. Гомель, ул. Могилевская, 1а. Конт. тел.: 25-26-46; +375 44 599-02-90.

Шаг аукциона – 5% от предыдущей названной цены продажи предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца ОАО «Табаквинторг»: р/с BY44PJCB30124055581000000933 ОАО «Приорбанк» (г. Гомель, ул. Красноармейская, 3а), БИК PJCBBY2X, УНП 400078357.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

Прием заявлений заканчивается 10.04.2023 г. в 16.00. Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте: www.deloocenka.by.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом **5%**. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплатить предмет торгов **тремя равными долями** каждые **15 (пятнадцать)** календарных дней со дня заключения договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1,0 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»
27 апреля 2023 г. проводит 5-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
25	Автомобиль BMW X6 xDrive 35i с дополнительным комплектом шин в составе: BMW X6 xDrive 35i легковой внедорожник универсал, 2011 г. в., куз. № X4XFG21140L511169, рег. № 7CHT4036, пробег 228 710 км; 2 автомобильные шины Hancook Winter I*cept evo 2SUV W320A 275/40 R20 106, 2018 г.; 2 автомобильные шины Hancook Winter I*cept evo 2SUV W320A 315/35 R20 106V, 2018 г.	г. Минск, ул. Первомайская, 7	45 000,00	9 000,00
26	Грузовой (пожарная установка) MAZ 437041, кузов (рама) № Y3943700C70 018038 Y3M43704150001840, рег. № АЕ 5966-6, 2005 г. в., пробег 56 998 км, 642,92 м/ч	г. Могилев, ул. Лазаренко, 72	8 600,00	1 720,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 27 апреля 2023 г. в 10.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 20 апреля 2023 г**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться 27 апреля 2023 г. с 9.15 до 10.00.

Победитель аукциона обязан:

1. заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона;

2. произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659; SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факс: 8 (017) 319-35-41, +375 (44) 583-77-45. Электронная почта: **auk@bsk.by.**

Извещение опубликовано на сайтах: http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Стройдетали»

222410, г. Вилейка, ул. Стахановская, 134

Раскрытие информации эмитента за 2022 год

4. Доля государства в уставном фонде эмитента – 0 %.

5-6. Информация о дивидендах и акциях	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Количество акционеров, всего	лиц	198	197
в том числе: юридических лиц	лиц	0	0
из них: нерезидентов Республики Беларусь	лиц	0	0
в том числе: физических лиц	лиц	198	197
из них: нерезидентов Республики Беларусь	лиц	2	2
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	тысяч рублей	279,06	453,99
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	тысяч рублей	279,06	453,99
Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги)	рублей	3,6831	5,9921
